незалежная газета

№ 25 (623) 8 ліпеня 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады





**Справа Зельцэра, Беразоўскі і Лукашэнка**

Старонка 3

**Палітбюро-2009: Зянон Ломаць**

Старонка 8



**Майкла Джэксана забілі «Фабрыкі зорак»**

Старонка 6

## У НУМАРЫ

**Даляр будзе даражэць**
Мяркуюць эксперты. **Старонка 2.**

**Павел Латушка**
ў кампаніі прэзідэнтаў і каралёў. **Старонка 3.**

**АБСЕ асудзіла сталінізм. Што з Лініяй Сталіна?**
МЗС Беларусі адмаўляецца ад каментароў. **Старонка 6.**

**Народ, што выжыў у атамных выпрабаваннях**
Пра уйгураў і іх лідэра, эмігрантку Рабію Кадыр, піша ўсходазнаўца Сяргей Богдан. **Старонка 7.**

**Выправа на Грунвальд: як гэта было**
Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 11.**

**«Басовішча-2009»**
і іншыя анонсы тыднёвай афішы. **Старонка 14.**

**Які шашлык здаравейшы?**
Добрае марынаванне мяса рэзка змяншае колькасць канцэрагенаў у ім. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Хто ёсць хто ва ўладзе?

Што за людзі сядзяць на кіроўных пасадах у Беларусі? Дзе яны нарадзіліся? Колькі ім гадоў? Дзе вучыліся? Хто служыў у арміі? Каго больш у найвышэйшых эшалонах – гомельскіх ці магілёўскіх? **Старонка 5.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



**Маршруты па Беларусі:**
## Мураванка

Старонка 12.

# ...а ключы ў Брусэлі

**Золатавалютныя запасы Беларусі ў чэрвені абрынуліся на $600 млн да небяспечнага ўзроўню. Будучыня рубля цяпер залежыць ад рашэння Еўрасаюзу па дадаткова запрошаным крэдыце.**

Золатавалютныя рэзервы Беларусі знізіліся ў чэрвені на $591 млн (18,3%) і на 1 ліпеня склалі $2647 млн проці $3238 млн на 1 чэрвеня, паведаміў Белстат.

Такім чынам, ад пачатку году ЗВР краіны знізіліся на $415 млн (13,5%) з $3061 млн на 1.01.2009.

І гэта пры тым, што за дадзены перыяд на рахункі Нацбанку прыйшло каля 2,1 млрд даляраў замежных крэдытаў і аплатаў ад «Газпрому». Плюс кітайскі своп на $3 млрд.

У ліпені падзенне ЗВР мае быць меншым дзякуючы атрыманню 670 млн даляраў ад МВФ. Нягледзячы на гэта, змрочная чэрвеньская статыстыка ставіць пад вялікае пытанне магчымасці працягу цяперашняе палітыкі ўладаў. Нацбанк трымаў курс рубля ад падзення, а ўрад пампаваў інвестыцыі ў эканоміку, каб утрымаць занятасць. У выніку Беларусь мае цяпер найніжэйшы ў рэгіёне ўзровень золатавалютных рэзерваў у прапорцыі да ВУП і імпарту.

Усё зараз будзе залежаць ад дадатковa запрошанага крэдыту ад Еўрасаюзу. Калі Беларусь не атрымае яго, ёй амаль непазбежна давядзецца ажыццявіць дадатковую дэвальвацыю рубля і пайсці на скарачэнне ўнутраных інвестыцый, у выніку чаго знізіцца таксама занятасць і тэмпы росту. Заменай крэдыту ЕС магла б стаць чарговая гіганцкая пазыка ад Расіі, аднак Масква абстаўляе яе ўмовамі, якія пярэчаць нацыянальным інтарэсам Беларусі. Сябар жа Уга Чавэс столькі грошай проста не мае.

Ключыкі ад будучыні хвалёнай лукашэнкаўскай эканамічнай мадэлі ляжаць у Маскве і Брусэлі.

**Мікола Бугай**

**Даляр у другім паўгоддзі будзе даражэць самымі хуткімі тэмпамі за апошнія 30 гадоў,** бо ЗША адновяцца пасля рэцэсіі хутчэй, чым Еўропа. Да такіх высноваў прыйшло агенцтва Bloomberg са спасылкай на меркаванне аналітыкаў, якія давалі найболей удалыя прагнозы валютных курсаў з пачатку году. Эксперты Deutsche Bank, Bank of America чакаюць падаражэння даляра на 17% у другім паўгоддзі.

**ЯМ**



**Следства па Аўтуховічу працягнулі**

Адвакат Павел Сапелка не ведае, да якой даты. Мікалай Аўтуховіч ужо больш за 80 дзён працягвае галадоўку пратэсту ў СІЗА. Лекар турэмнага шпіталю кажа, што вязня ратуюць толькі кропельніцы з глюкозай.

# Абвіначанне Аўтуховіча ў тэрарызме развалілася?

У Ваўкавыску байцамі «Алмазу» затрыманая дырэктарка фірмы «Ніка–таксі 22222».

Людмілу Парэнскую арыштавалі ў аўторак 7 ліпеня. Па яе прыехала спецпадраздзяленне з Мінску.

Праваабаронца Алег Волчак сцвярджае, што крымінальная справа супраць ваўкавыскіх прадпрымальнікаў можа павярнуцца ў іншы бок — незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць.

У фірме Парэнскай Аўтуховіч працаваў шафёрам. Парэнскую ўжо выклікалі даваць паказанні. Яе схілялі паказаць, што фірма належыць Мікалаю Аўтуховічу і Уладзіміру Асіпенку. Калі б гэта пацвердзілася, тады можна было б высунуць абвінавачанне ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці Аўтуховічу і Лявонаву.

**Зміцер Панкавец**

# Грошай многа не бывае

Чарговы крэдыт МВФ атрыманы. Умовай наступнай траншы стане прыватызацыя і незалежнасць Нацбанку.

Беларусь атрымала чарговую частку крэдыту ад Міжнароднага валютнага фонду. 2 ліпеня дзяржаве было пералічана 679 мільёнаў даляраў. Сусветныя фінансісты пагадзіліся павялічыць агульную суму крэдыту да 3,52 мільярда даляраў і ўхвалілі тыя крокі, якія ўжо былі зробленыя Беларуссю. Нагадаем, што ўлады пашырылі валютны калідор з 5% да 10%, абяцалі зрабіць бюджэт бездэфіцытным і пакуль што замарозілі рост заробкаў.

Наступныя патрабаванні МВФ — прыватызацыя прадпрыемстваў і большая незалежнасць Нацбанку. Выкананне гэтых умоваў дазволіць Беларусі атрымліваць наступныя порцыі крэдыту.

Міжнародны валютны фонд пакрысе змяняе тып эканомікі Беларусі са змяшанага на рынкавы, не пакідаючы пры гэтым уладам выбару. Можна спрачацца, гандлявацца, але давядзецца зрабіць так, як настойліва параілі сусветныя фінансісты.

Адпаведнымі дакументамі вызначаныя нават прыблізныя тэрміны старту прыватызацыі. Ужо да лютага 2010 году беларускім бокам на адкрыты міжнародны гандаль могуць быць выстаўленыя кантрольныя пакеты першых пяці буйных дзяржаўных прадпрыемстваў. Якіх? Раней гаворка ішла пра частковы («Беларусбанк» і «Белаграпрамбанк») ці поўны («БПС-Банк» і «Белінвестбанк») продаж толькі буйных дзяржаўных банкаў.

Да верасня гэтага году ўрад з удзелам Сусветнага банку павінен распрацаваць і накіраваць у парламент праект Закону аб прыватызацыі. Паралельна павінна стварыцца Агенцтва па прыватызацыі, якое, па задумах, узначаліць прыватызацыйныя працэсы ў краіне.

**Ягор Марціновіч**

# Палітвязня вяртаюць за краты

7 ліпеня Асіповіцкі раённы суд вынес вырак Арцёму Дубскаму — год калоніі.



Хлопца судзілі па артыкуле 415 КК «Парушэнне адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі». Артыкул перадугледжвае толькі турму, але нядаўні выпадак з Максімам Дашуком дазваляў спадзявацца на больш аптымістычны вынік паседжання.

У лютым Арцёма затрымалі на Гомельскім чыгуначным вакзале, калі хлопец ехаў у Мінск з Кіева. Два месяцы «маладафронтавец» правёў у асіповіцкім і бабруйскім ізалятарах. Перад стартам «Усходняга партнёрства» Дубскага нечакана выкінулі з турмы. Амаль адразу пасля вызвалення ён узяў актыўны ўдзел у галадоўцы салідарнасці з Мікалаем Аўтуховічам.

Суддзя Жанна Шарабайка задаволіла патрабаванні пракурора Лазарэнкі цалкам. Арцёму кайданкі адзелі проста ў судовай залі.

**ЗП**

# Баптысты — грамадзяне другога гатунку?

Лукашэнка назваў наяўнасць баптыста ў шэрагах міліцыі «злачынным праколам у ідэалагічнай і кадравай працы». «Асобныя супрацоўнікі МУС з'яўляюцца актыўнымі чальцамі сумнеўных рэлігійных сектаў. Яны ўявілі сябе пратэстанцкімі пастарамі. Гэтак, увайшоўшы ў кіраўніцтва адной з грамад баптыстаў, оперупаўнаважаны ГУУС Мінгарвыканкаму аказваў кансультацыйную дапамогу сваім братам, раскрываючы формы й метады правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў», — заявіў ён на нарадзе, прысвечанай міліцыі. Гаворка, напэўна, пра чалавека, які расказаў братам па веры, якім чынам іх могуць падслухоўваць.

**Мікола Бугай**


# Не ўсё ў жыцці ў апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй за ахвяраванні

**А.Г.** з Бабруйскага раёну.
**Наталлі І.** з Пухавіцкага раёну.
**Паўлу Л.** з Хойніцкага раёну.
**А.Б.** з Ваўкавыскага раёну.
**Д.К.**, **Дзмітрыю Р.** з Рагачоўскага раёну.
**С.С.** з Жлобінскага раёну.
**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.
**Георгію С.** з Бешанковіцкага раёну.
**Івану Л.** з Пружанскага раёну.
**Святаславу Г.** з Талачынскага раёну.
**Алене Г.** з Барысаўскага раёну.
**Мікалаю В.** з Бярозаўскага раёну.
**Юрасю Ч.** з Мазырскага раёну.
**Н.Х.** з Шчучынскага раёну.
**Антону Б.** з Верхнядзвінскага раёну.
**С.К.** з Пінскага раёну.
**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.
**Анатолю К.** з Стаўбцоўскага раёну.

# Справа Зельцэра, Беразоўскі і Лукашэнка

**Чаму мільярдэр свабодна прыязджаў у Мінск, хоць у Расіі выпісаны ордэр на яго арышт?**





Амаль паўтара году знаходзіўся ў беларускай турме амерыканскі адвакат Эмануіл Зельцэр. Вызвалены з магілёўскай калоніі ён быў а дзесятай вечара 30 чэрвеня. Ужо праз некалькі гадзін Зельцэр вылецеў у Нью-Ёрк. Вызваленне адбылося пасля сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з кангрэсменамі з ЗША.

Амерыканцы паставілі перад беларускім лідэрам пытанне аб іх грамадзяніне, які знаходзіцца ў зняволенні. «Ніколі не думаў, што гэты чалавек стане праблемай у стасунках між нашымі дзяржавамі. Так, паводле беларускіх законаў я магу памілаваць Зельцэра. Вы звярнуліся да мяне з гэтай просьбай, так ці не? Калі гэта для Амерыкі важна і будзе судзейнічаць нармалізацыі нашых стасункаў, я сёння ж падпішу ўказ», — заявіў А.Лукашэнка. У той жа дзень указ быў падпісаны.

Дык што за гісторыя здарылася з амерыканскім адвакатам?

### Арышт

Эмануіл Зельцэр быў арыштаваны разам са сваёй сакратаркай, грамадзянкай Расіі Уладленай Функ, 12 сакавіка 2008 году проста ў мінскім аэрапорце. Дакладна вядома, што прыляцелі яны на самалёце расійскага алігарха Барыса Беразоўскага, які доўгі час жыве ў Лондане.

Паводле адных звестак, у Мінск яны павінны былі прыляцець планава па справе нядаўна перад гэтым памерлага грузінскага мільянера Бадры Патаркацышвілі, які ўкладаў грошы і ў беларускія прадпрыемствы — «Белнафтахім», «Нафтан», а таксама меў актывы ў нашай краіне. Зельцэр займаўся спадчынай нябожчыка, і ў сталіцы Беларусі ў іх нібыта павінная была адбыцца працоўная сустрэча.

Уладлена Функ жа пасля вызвалення ў інтэрв'ю сайту naviny.by расказала, што ў Мінск іх прывезлі гвалтоўна. Яны насамрэч за дзень да арышту былі на сустрэчы ў Беразоўскага, дзе па неасцярожнасці выпілі па кубачку кавы. Прачнуліся яны ўжо толькі ў Мінску, там іх і арыштавалі.

Мала хто сумняецца, што гэты досыць таямнічы арышт не быў звязаны са спадчынай Патаркацышвілі. Беразоўскі як былы партнёр па бізнэсе адразу заявіў, што прэтэндуе на 50% ад яе. Тым не менш, паводле тэстаменту распараджацца мільёнамі павінен быў Джозаф Кей, далёкі сваяк Патаркацышвілі. Удава грузінскага алігарха адразу засумнявалася ў сапраўднасці такога рашэння мужа. І пачаліся доўгія суды.

Пазней стала вядома, што яшчэ 3 сакавіка адвакаты Беразоўскага звярнуліся ў Генеральную пракуратуру Беларусі з папярэджаннем, што ў Мінск можа прыляцець Зельцэр з фальшывымі дакументамі.

### Зняволенне

Ужо на наступны дзень пасля арышту Эмануіл Зельцэр тэлефанаваў са свайго мабільніка Джозэфу Кею. Існуе аўдыёзапіс размовы, дзе Зельцэр настойліва прасіў Кея прыехаць у Мінск і прывезці неабходныя паперы.

Кей (таксама расійскамоўны) адпіраўся. Казаў, што не можа ехаць, бо ў яго няма беларускай візы — з Мінску нядаўна адклікалі амерыканскага пасла. Але Зельцэр настойваў на сваім. «Я не магу туды зрывацца, як ты. Ты згадзіўся з Барысам, ён табе растлумачыў, дзеля чаго туды ехаць», — казаў па тэлефоне Кей.

Потым Зельцэр раскажа журналістам, што тэлефанаваў пад прымусам супрацоўнікаў спецслужбаў.

Першапачаткова Зельцэру інкрымінавалі ўвоз у Беларусь наркатычных рэчываў, але тым не менш судзілі яго ўжо за камерцыйны шпіянаж (нібыта спрабаваў набыць інфармацыю пра нафтаперапрацоўчую галіну Беларусі) і за падробку дакументаў (спадчыны Патаркацышвілі).

Па словах і Функ, і Зельцэра, на суд у Мінск прыязджаў асабіста Барыс Беразоўскі, які абвешчаны ў міжнародны вышук. Арыштаваныя сведчаць, што Беразоўскі быў галоўным сведкам на працэсе і хадзіў з узброеным ахоўнікам. Адвакат Зельцэра Дзмітры Гарачка выказаўся пра тое, што Беразоўскі — збеглы злачынца, і яго трэба затрымаць. Рэакцыяй на гэта быў толькі смех. Пасля Зельцэр і Беразоўскі сустракаліся яшчэ ў турме, дзе пра гаварылі дзве гадзіны. Пра што, амерыканец не ўдакладняе.

Уладлена Функ кажа, што на судзе быў сведка «Шастакоў», якога яна пасля вызвалення пабачыла ў газеце: у яго было іншае прозвішча, і аказаўся ён высокім беларускім чыноўнікам.

Суд праходзіў за зачыненымі дзвярыма. У выніку Эмануіл Зельцэр атрымаў тры гады калоніі, а Уладлена Функ — год.

### Турма

Адбываць пакаранне Зельцэра адправілі ў Магілёўскую калонію, а Уладлену Функ — у Гомель. Зельцэра некалькі разоў наведваў часовы паверан па справах ЗША Джонатан Мур, а вось персона Функ расійскае пасольства не зацікавіла.

Пасля вызвалення Зельцэр шмат разоў дзякаваў супрацоўнікам Дзяржэпартаменту ЗША. Маўляў, толькі дзякуючы іх дапамозе ён апынуўся на волі. «Мне пашанцавала быць грамадзянінам вялікай краіны», — заявіў Зельцэр.

За кратамі арыштаваны трымаў галадоўку пратэсту, бо доўгі час яго прозвішча не маглі ўнесці ў спісы на амністыю.

### Хто ж такі Зельцэр?

Эмануіл Зельцэр быў народжаны ў Савецкім Саюзе, але ўжо ў 1970-я гады з'ехаў у Ізраіль, адкуль перабраўся ў ЗША. За акіянам Зельцэр заслужыў славу афэрыста і махляра. Ніхто нават не ўпэўнены, ці насамрэч у яго ёсць юрыдычная адукацыя. Некалькі разоў правасуддзе спрабавала прыцягнуць яго да адказнасці за падробку дакументаў. Тое, што не атрымалася ў амерыканцаў, зрабілі беларусы.

Разам з тым, у «справе Зельцэра» найбольш забіраюць увагу неафішаваныя сувязі між Лукашэнкам і Беразоўскім, які, не баючыся арышту, вольна прыязджаў у Мінск. Хоць у Расіі выпісаны ордэр на яго арышт. Як бы тое ні было, але ў справу ўцягнуты вялікія грошы, а дзе вялікія грошы, там цяжка дакапацца да ісціны.

**Зміцер Панкавец**



## Павел Латушка ў кампаніі прэзідэнтаў і каралёў

У Вільні прайшлі святочныя мерапрыемствы ў гонар 1000-годдзя Літвы. Святкаванне пачалося з ганаровага падняцця дзяржаўнага сцягу, а таксама трох выбухаў з гарматы XVIII стагоддзя ў гонар караля Міндоўга, чарговую гадавіну каранавання якога адзначалі 6 ліпеня.

Для ўдзелу ў мерапрыемствах у Вільню прыехалі каралі і прэзідэнты еўрапейскіх дзяржаваў. Сярод гасцей былі прэзідэнты Украіны Віктар Ющчанка, Грузіі — Міхаіл Саакашвілі, Ісландыі — Улафур Рагнар Грымсан, Фінляндыі — Тар'я Халанэн, Латвіі — Валдыс Затлерс, Польшчы — Лех Качыньскі, кароль Нарвегіі Харальд V, Швецыі — Карл XVI Густаў, каралева Даніі Маргарыта ІІ, прэм'ер-міністр Эстоніі Андрус Ансіп.

Усіх гасцей у рэзідэнцыі прымаў прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус з жонкай Алмай Адамкене.

Беларусь на святкаванні прадстаўляе міністр культуры Павел Латушка **(на фота — з Адамкусамі)**. Тыдзень таму падчас перамоваў у Гродне з літоўскім калегам на 1000-годдзе быў запрошаны прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, але ў яго, пэўна, знайшліся больш пільныя справы.

Міністрам культуры рэпрэзентаваная на ўрачыстасцях і Расія.

**ЗП**

## Калякін і Лябедзька: Беларуска-расійскім адносінам патрэбная перазагрузка

У апошнія тыдні беларускія апазіцыянеры двойчы наведвалі Маскву.

Спярша ў Белакаменнай былі Сяргей Калякін (ПКБ) і Анатоль Ляўковіч (БСДГ). Яны ўзялі ўдзел у III Міжнародным сацыялістычным форуме, які ладзіла партыя «Справядлівая Расія» Сяргея Міронава.

Сустрэцца з Міронавым у Калякіна не выйшла. «Але грунтоўна пагутарыў з дарадцам Міронава Аляксандрам Падлесавым», — гаворыць лідэр апазіцыйных камуністаў.

У Маскве С.Калякін быў не як прыватная асоба, прадстаўляў партыю. Ці ПКБ разглядае «Справядлівую Расію» як свайго галоўнага партнёра на ўсходзе? «З «СР» можна весці дыялог. Хоць партыя і выступае за «кіраваную дэмакратыю», яна была створаная зверху. Але гэта наш адзіны партнёр у Расіі, іншых папросту няма», — кажа С.Калякін.

Праз тыдзень пасля Калякіна Маскву наведалі лідэр АГП Анатоль Лябедзька і яго намеснік Яраслаў Раманчук. Першы гаворыць, што трэба канчаць з манаполіяй Крамля і мінскага Чырвонага дому на абмеркаванне беларуска-расійскіх стасункаў.

У Маскве Лябедзька сустракаўся з Уладзімірам Рыжковым, сустаршынём партыі «Правое дело» Леанідам Гозманам, прадстаўніком руху «Салідарнасць» Іллём Яшыным.

«Праект саюзнай дзяржавы мёртвы. Трэба пераходзіць на двухбаковыя партнёрскія адносіны між суверэннымі дзяржавамі, каб не паўтараліся гэтыя малочныя войны», — кажа А.Лябедзька. Лідэр АГП лічыць, што на расійскім вектары трэба працаваць, хоць ён і цяжкі: «АДС мусіць мець дакумент, які б адказваў на асноўныя пытанні беларуска-расійскіх стасункаў. Як з Малой канстытуцыяй і Антыкрызіснай платформай».

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Дзевяць гадоў таму знік Завадскі

7 ліпеня 2000 г. ён паехаў у аэрапорт сустрэць калегу Паўла Шарамета. З таго часу Завадскага ніхто не бачыў. Яго аўтамабіль быў знойдзены ў аэрапорце.

### Нісцюк і вецер

Не ўдалося Уладзіміру Нісцюку стаць дэпутатам палаты, пайшоў ганяць вецер. Былы намеснік старшыні БСДП цяпер значыцца старшынём рады заснавальнікаў ААТ «Белветраэнерга».

### Новыя зоркі Жадобіну і Зайцаву

Лукашэнка падпісаў указ аб наданні чарговых воінскіх званняў дзяржаўнаму сакратару Рады бяспекі Юрыю Жадобіну і старшыню КДБ Вадзіму Зайцаву.

### Дактыласкапію па выбуху прайшлі 1,3 млн чалавек

Падазраванымі ва ўчыненні выбуху ў Мінску 4 ліпеня 2008 году пабывала 120 чалавек. Следства вядзецца кругласутачна, заяўляюць у кіраўніцтве МУС. А вынік — пшык.

**ЗП, БелаПАН**

# Рэйтынг эканамістаў

## Хто з беларускіх незалежных эканамістаў лепш за ўсіх адгадвае крокі дзяржавы?

Незалежных эканамістаў у Беларусі няшмат. Увогуле, незалежных шмат, толькі большасць з іх маўчыць, як юнак на дапросе. Тых, якія выступаюць публічна, — дзесятак. Іх меркаванні запатрабаваныя беларускімі газетамі і інтэрнэт-сайтамі. Леанід Заіка, Леанід Злотнікаў, Яраслаў Раманчук і кампанія вандруюць з аднаго СМІ ў другі. Прагнозы раздаюцца дзесяткамі, але ці спраўджваюцца яны?

Вядома, што прагнозы — рэч няўдзячная, але ў каго з незалежных эканамістаў усё ж атрымалася зразумець логіку дзяржавы і хто можа пралічваць яе наступныя крокі?

«НН» узгадала прагнозы, што паспелі нарабіць беларускія эканамісты за апошнія месяцы. Гэтыя меркаванні выказваліся імі ў газетных інтэрв'ю, падчас анлайн-канферэнцый і круглых сталоў. Такім чынам, экзамен на дакладнасць прагнозаў здаюць кіраўнік навукова-даследчага цэнтру Мізэса Яраслаў Раманчук, кіраўнік аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леанід Заіка, былы кіраўнік Нацыянальнага банку Станіслаў Багданкевіч і эканаміст Леанід Злотнікаў. Апошнім удзельнікам спаборніцтва будзе дзяржаўны прагноз — можа, беларусы выйграюць, калі пачнуць верыць уладам?

Якія ключавыя моманты маглі спрагназаваць эканамісты? Акцэнт быў зроблены на меркаваннях, выказаных у канцы 2008 году пра магчымую дэвальвацыю рубля, прагнозах у пачатку 2009 году наконт перспектываў беларускай эканомікі ў паслядэвальвацыйны перыяд, прагнозах росту інфляцыі і павышэння цэн цягам году, характарыстыцы валютнага крызісу ў сакавіку.



Леанід Заіка.



Леанід Злотнікаў.



Яраслаў Раманчук.



Станіслаў Багданкевіч.

### Восень-зіма 2008. Ці чакаць у найбліжэйшы час дэвальвацыі беларускага рубля? Якой яна будзе?

**С.Багданкевіч:** Нясіце грошы ў банкі, і я даю гарантыю, што на працягу шасці месяцаў абвалу не будзе. Для раптоўнага абвалу ў банкаўскай сферы няма прычын. Даць гарантыю на банкаўскія уклады на больш доўгі тэрмін я не магу (27.12.2008). **Адзнака — 0.**

**Л.Заіка:** Дэвальвацыю можна праводзіць па ўкраінскім сцэнары — на 50%, — тады ўсе, хто зарабляе ў далярах, будуць вельмі радыя, а вось астатнія... Але гэта рабіць небяспечна. Я думаю, што будзе больш мяккая дэвальвацыя (29.12.2008). **Адзнака — 4.**

**Л.Злотнікаў:** Што да першых двух месяцаў наступнага году, то там альбо пройдзе планавая дэвальвацыя, альбо гэта можа адбыцца стыхійна. Бо запасаў валюты, нават з улікам расійскага крэдыту, не хопіць, каб захаваць фінансавую стабільнасць (25.11.2008). **Адзнака — 4.**

**Я.Раманчук:** Я думаю, дэвальвацыя будзе мінімум працэнтаў 40. Калі палічыць, то атрымліваецца, што даляр будзе каштаваць тры тысячы. Я ўпэўнены, што дэвальвацыя павінная адбыцца (29.12.2008). **Адзнака — 3.**

**Улада (А.Лукашэнка):** Ніякага абвалу не будзе. Усё будзе адбывацца ў зададзеных параметрах. У нас назапашаныя пэўныя сродкі, і мы выкарыстоўваем іх мала (25.11.2008). **Адзнака — 0.**

Аднамомантавая 20-працэнтная дэвальвацыя рубля адбылася 2 студзеня 2009 году. Ад таго моманту рубель зняцэніўся яшчэ на 5%. У цэлым эканамісты далі правільны прагноз, але дакладны паказчык «25%» не прагучаў ні ў кога. Зрэшты, тыя, хто прыслухоўваўся да экспертаў, паспелі перавесці ўклады ў валюту.

### Студзень 2009. Як будзе паводзіць сябе курс рубля далей? Ці чакаць наступнай дэвальвацыі?

**С.Багданкевіч:** Ёсць пэўныя рэзервы, я маю на ўвазе і золатавалютныя рэзервы Нацбанку, і крэдыты МВФ, і крэдыт Расіі, і магчымасць продажу нерухомасці (акцыяў) нашых дзяржаўных прадпрыемстваў. Магчымасць трымаць курс ёсць (06.01.2009). **Адзнака — 5.**

**Л.Заіка:** Дэвальвацыю рубля ўжо не спыніць, і ў найбліжэйшыя дзесяць дзён даляр вырасце да трох тысяч беларускіх рублёў. (03.01.2009). Вось калі ў чэрвені-ліпені скончацца ўсе пазычаныя Беларуссю мільярды даляраў, тады людзі ўбачаць, што грошай у дзяржавы сапраўды няма (21.04.2009). **Адзнака — 0.**

**Л.Злотнікаў:** Калі мы не атрымаем вялікіх крэдытаў акрамя ўжо абяцаных ад Расіі і МВФ, то можна чакаць, што ўвесну ці ў пачатку лета адбудзецца яшчэ адзін скачок у дэвальвацыі [яшчэ працэнтаў на 20] (08.01.2009). **Адзнака — 3.**

**Я.Раманчук:** Да канца студзеня даляр будзе каштаваць тры тысячы беларускіх рублёў. І гэта толькі пачатак (05.01.2009). **Адзнака — 0.**

**Улада (А.Лукашэнка, П.Пракаповіч):** Прамыслоўцам карцела б яшчэ на 20% дэвальваваць рубель. Але мы народу паабяцалі і будзем сваё абяцанне трымаць (10.02.2009). Плюс-мінус 5% — гэта тая гарантыя стабільнасці курсу нацыянальнай валюты, якая будзе на працягу году. Ніякіх адступленняў ці перагляду ў той ці іншы бок не будзе (30.04.2009). **Адзнака — 0.**

Яшчэ адной разавай дэвальвацыі не адбылося. Аднак за паўгоду Нацбанк дайшоў да мяжы ўсталяванага валютнага калідору, і яго памер быў перагледжаны да 10%. Даляр і еўра за паўгоду падаражэлі на 7%. Даляр цяпер каштуе каля 2830 рублёў. Эксперты ж чакалі, што трохтысячная мяжа будзе пераадоленая ўжо ў студзені. І толькі С.Багданкевіч, які ў снежні сеў у лужыну, гэтым разам быў самы дакладны.

### Якіх вышыняў дасягне інфляцыя? Што будзе з цэнамі?

**С.Багданкевіч:** Беларуская эканоміка ў найбліжэйшы час будзе ісці да інфляцыі ў двухзначных велічынях — ад 12 да 20 адсоткаў (06.01.2009). **Адзнака — 5.**

**Л.Заіка:** З прычыны што курс будзе складацца не на карысць рубля, інфляцыя складзе прыкладна палову ад плаўнай дэвальвацыі плюс інфляцыйныя кампаненты — 17—25% (19.02.2009). **Адзнака — 3.**

**Л.Злотнікаў:** Толькі ў першым квартале рост інфляцыі складзе 15—20% (02.01.2009). **Адзнака — 2.**

**Я.Раманчук:** Інфляцыя ў 2009 годзе, калі не зменіцца стаўленне Нацбанку і не будуць скарочаныя дзяржаўныя выдаткі, складзе каля 30% (08.01.2009). **Адзнака — 2.**

**Улада (Міністэрства эканомікі):** Паводле прагнозу, у першым паўгоддзі 2009 году ўзровень інфляцыі не павінен перавысіць 8%, агулам за год — 11%. **Адзнака — 5.**

Паводле афіцыйнай статыстыкі, інфляцыя за студзень—май 2009 году склала 6,9%. У пераліку на гадавы паказчык гэта азначае, што інфляцыя выйдзе на двухзначную, але не перавысіць 15%. У той жа час эканамісты выказваюць сумневы наконт дакладнасці афіцыйнай статыстыкі, але альтэрнатыўных падлікаў прапанаваць не могуць.

### Вынікі (сярэдні бал)

**С.Багданкевіч — 3,3.** Фраза «нясіце грошы ў банкі», неасцярожна прамоўленая за некалькі дзён да дэвальвацыі, не магла не падарваць аўтарытэт фінансіста. Тым не менш, наступныя яго прагнозы — даволі асцярожныя ў параўнанні з астатнімі эканамістамі — аказаліся блізкімі да рэчаіснасці.

**Л.Злотнікаў — 3.** Самыя змрочныя прагнозы звычайна належаць менавіта гэтаму эксперту. Штогадовы передвеснік абвалу беларускай эканомікі ўважліва адсочвае эканамічныя тэндэнцыі, але нярэдка згушчае фарбы. Аднак у часы глабальнага крызісу менавіта прадказанні песіміста аказаліся даволі дакладнымі.

**Л.Заіка — 2,3, Я.Раманчук — 1,7.** У гэтых эканамістаў даволі падобныя прагнозы, аднак меліся адрозненні ў лічбах. Да іх меркавання можна прыслухоўвацца, але безаглядна верыць не варта. Дзіва што — пралічыць дзеянні дзяржавы не ўстане ніхто.

**Улада — 1,7.** Асноўная мэта прагнозаў — не дапусціць панікі сярод насельніцтва. Тым не менш, частку сваіх абяцанняў яна выконвае. Хаця б на словах.

**Ягор Марціновіч**

## За год курс рубля абваліўся на 33% да даляра і юаня

Калі параўнаць курсы, выстаўленыя Нацыянальным банкам 1 ліпеня 2008 і 1 ліпеня 2009 гадоў, можна даведацца, як змяніліся за год суадносіны між беларускім рублём і іншымі валютамі.

**ЯМ**

**У адносінах да BRB**




**Валюты, якія ўзмацніліся**

**Японская ена:** 46% (курс валюты год таму 20,2 рубля, цяпер — 29,6 рубля)

**Амерыканскі даляр:** 33% (2125—2825)

**Кітайскі юань:** 33% (310—414)

**Літоўскі літ:** 19% (973—1155)

**Латвійскі лат:** 19% (4769—5674)

**Еўра:** 18% (3360—3985)

**Брытанскі фунт стэрлінгаў:** 11% (4240—4711)

**Расійскі рубель:** 0,25% (90,8—91.0)

**Валюты, якія саслабелі**

**Украінская грыўна:** −21% (465—369)

**Польскі злоты:** −11% (1001—892)

Самай дарагой валютай застаўся **кувейцкі дынар**. Цяпер ён каштуе 9841 рубель (узмацніўся на 23%).

## СЦІСЛА

### Да верасня заробкі не вырастуць

Пра гэта заявіў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка. Ці варта падвышаць заробкі, улады будуць вырашаць у верасні ці пазней.

### Беларусь створыць свабодную зону гандлю з ЕС

Праз тры-чатыры гады беларускія тавары змогуць рухацца па Еўрасаюзе з найменшымі перашкодамі, упэўнены віцэ-прэм'ер Беларусі У.Сямашка.

### $1,15 млрд на аграгарадкі

На ўладкаванне аграгарадкоў у Гродзенскай вобласці з бюджэту мяркуецца выдаткаваць больш за 3,3 трлн рублёў (каля 1 млрд 150 млн даляраў).

### Беларусь павялічыла пошліну на экспарт нафты ў 1,4 разу

Стаўка экспартнай пошліны на сырую нафту ў Беларусі павысілася з $152,8 да $212,6 за 1 тону. Мыты на нафту ў Беларусі прывязаныя да расійскіх.

### Кітай за стварэнне новай сусветнай рэзервавай валюты

Азіяцкая краіна патрабуе абмеркаваць прапанову на саміце Вялікай васьмёркі.

### Забраць у багатых, аддаць бедным

Фонд нацыянальнага развіцця Беларусі пашыраецца на 143 мільёны даляраў. Цяжар штомесячных адлічэнняў ляжа на плечы 104 беларускіх прадпрыемстваў. Найбольшую суму выплаціць «Беларуськалій» — 94 мільёны даляраў за год.

**ЯМ**

# Хто ёсць хто ва ўладзе?

**Што за людзі знаходзяцца на кіроўных пасадах у Беларусі? Дзе яны нарадзіліся? Колькі ім гадоў? Дзе вучыліся? Хто служыў у арміі? Каго больш у найвышэйшых эшалонах — гомельскіх ці магілёўскіх?**

Каб адказаць на гэтыя пытанні, мы ўзялі біяграфіі прэм'ер-міністра і ягоных намеснікаў, супрацоўнікаў Адміністрацыі прэзідэнта, двух спікераў верхняй і ніжняй палатаў парламенту, старшыняў асноўных судоў, генпракурора, кіраўнікоў Рады бяспекі і Нацбанку, міністраў, старшыняў дзяржаўных і нацыянальных камітэтаў, а таксама кіраўнікоў абласцей. Агулам павінна было атрымацца 60 чалавек, аднак вакантнымі на сёння з'яўляюцца месцы міністра працы і сацыяльнай абароны (пасля павышэння Патупчыка) і мэра Мінску (пасля хваробы Паўлава), таму выйшла 58 персаналіяў.

## Найбольш барысаўскіх і бабруйскіх

Калі браць месцы нараджэння чыноўнікаў, то досыць прадказальна першым ідзе Мінск. У сталіцы нарадзілася шэсць чалавек. Гэта старшыня Вярхоўнага Суду Валянцін Сукала, генпракурор Рыгор Васілевіч, старшыня Дзяржаўнага камітэту па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч, міністр фінансаў Андрэй Харкавец і міністр культуры Павел Латушка. Трое апошніх — сярод наймаладзейшых у атачэнні Лукашэнкі.

Чатыры чалавекі нарадзіліся ў Барысаве і раёне. Адтуль адразу тры міністры — сувязі і інфарматызацыі (Мікалай Панцялей), юстыцыі (Віктар Галаванаў), транспарту і камунікацый (Іван Шчэрба). Таксама на Барысаўшчыне нарадзіўся старшыня Дзяржкамітэту па маёмасці Георгій Кузняцоў.

Тры чалавекі ва ўладзе былі са Слонімшчыны. Аднак пасля звальнення міністра прыродных рэсурсаў Лявонція Харужыка слонімскіх паменела. Засталося двое. Затое якіх!

Найперш гэта кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. Дарэчы, нідзе ў афіцыйных крыніцах не значыцца дакладнае месца нараджэння Уладзіміра Уладзіміравіча. Пішуць проста «Гродзенская вобласць». Больш падобных выпадкаў няма.

Таксама са слонімскіх земляў міністр абароны Леанід Мальцаў. Цікавая акалічнасць, абодва «слонімкія» міністры да нядаўняга часу знаходзіліся на сваёй пасадзе найбольш з чальцоў Саўміну. Харужык — з лютага 2001 года, Мальцаў — з сакавіка таго ж года. Таксама прызначэнцам васьмігадовай даўніны быў былы кіраўнік МУС Уладзімір Навумаў.

З Бабруйску паходзяць міністр гандлю Валянцін Чэканаў, міністр энэргетыкі Аляксандр Азярэц, а таксама старшыня Мытнага камітэту Аляксандр Шпілеўскі.

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі і старшыня Гомельскага аблвыканкаму Аляксандр Якабсон — з Гомеля.

Старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Віктар Камянкоў і міністр ЖХГ Уладзімір Белахвостаў — з Бялыніцкага раёну. З Смаргоншчыны — старшыня памежнага камітэту Ігар Рачкоўскі і міністр прамысловасці Аляксандр Радзевіч.

**Магілёўскі аблвыканкам і райкамы застаюцца галоўнай кузняй кадраў.**

Больш паўтарэнняў няма. Па адным чыноўніку нарадзілася ў наступных раёнах: Ваўкавыскі, Лёзненскі, Вілейскі, Мядзельскі, Пружанскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Петрыкаўскі, Светлагорскі, Магілёўскі, Лідскі, Драгічынскі, Івацэвіцкі, Смалявіцкі, Быхаўскі, Валожынскі, Любанскі, Іўеўскі, Асіповіцкі, Лунінецкі, Аршанскі, Касцюковіцкі, Нясвіжскі, Брагінскі, Мазырскі, Чэрвенскі.

Адзіным шклоўскім па нараджэнні быў Міхаіл Паўлаў, які нядаўна пакінуў пасаду начальніка сталіцы.

## Кадэбісты — з іншых краінаў

11 чалавек з кіраўніцтва краіны нарадзіліся за яе межамі. Расія як месца нараджэння значыцца ў пашпартах 6 чыноўнікаў, Украіна — 2, Азербайджан — 2, Арменія — 1.

У Наўгародскай вобласці прыйшоў на свет віцэ-прэм'ер Віктар Бура, ягоны калега Андрэй Кабякоў — у Маскве. Праўда, апошні нядаўна расказваў, што ў Беларусі жыве ад трохгадовага ўзросту.

З сяла Сіма Юр'еў-Польскага раёну Уладзіміраўскай вобласці — намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Леанід Анфімаў. Радзіма міністра эканомікі Мікалая Зайчанкі — Прыморскі край. З усходняй суседкі таксама міністры архітэктуры Аляксандр Селязнёў і старшыня Ваеннапрамысловага камітэту Мікалай Азаматаў.

Ва Украіне нарадзіліся толькі двое высокіх службоўцаў, але хто — былы і сённяшні старшыні КДБ. З Днепрапятроўску паходзіць кіраўнік Рады бяспекі Юры Жадобін, з Жытомірскай вобласці — галоўны чэкіст краіны Вадзім Зайцаў.

Землякамі з'яўляюцца міністры па надзвычайных сітуацыях і ўнутраных справаў Энвер Барыеў і Анатоль Куляшоў адпаведна. Яны нарадзіліся ў невялічкім 68-тысячным азербайджанскім гарадку Алі-Байрамлы, які нядаўна быў перайменаваны ў Шырван.

У армянскім Ленінакане нарадзіўся будучы міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў.

Зрэшты, сталенне амаль усіх вышэйпералічаных чыноўнікаў адбывалася ў Беларусі. Выключэннем з'яўляюцца хіба што Жадобін і Зайцаў.

## Найменш віцебскіх

Такім чынам, прапорцыі ва ўладзе выглядаюць наступным чынам: краіны СНД і Мінская вобласць — па 11 чалавек (19% ад агульнай колькасці), Магілёўская вобласць — 9 (15,5%), Гомельская вобласць — 8 (13,8%), Гродзенская вобласць — 7 (12%), Мінск — 6 (10,3%), Брэсцкая вобласць — 4 (6,9%), Віцебская вобласць — 2 (3,4%).

Аднак звесткі пра месца нараджэння мала значаць у разуменні палітычных повязяў. Важней тое, у якім месцы чалавек рабіў працоўную кар'еру.

Дык вось, нягледзячы на не самае вялікае прадстаўніцтва ўраджэнцаў Магілёўшчыны, тамтэйшы аблвыканкам і райкамы з'яўляюцца сапраўднай кузняй кадраў на павышэнне. Адтуль выйшлі Віктар Камянкоў, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Мікалай Снапкоў, Аляксандр Селязнёў, Уладзімір Белахвостаў, міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, Валянцін Чэканаў, Віктар Галаванаў, старшыня Гродзенскага аблвыканкаму Уладзімір Саўчанка. Хоць яны не ўсе нарадзіліся на Магілёўшчыне, але ўсе там працавалі.

**Людзі пенсійнага і перадпенсійнага ўзросту складаюць большасць у найвышэйшых эшалонах улады.**

З Гомельскай вобласці выйшаў цэлы шэраг «крэпкіх хазяйственнікаў», людзей, якія сёння распараджаюцца надзёнымі пытаннямі беларускай эканомікі — Сяргей Сідорскі, а таксама адразу чатыры віцэ-прэм'еры: Уладзімір Сямашка, Андрэй Кабякоў, Іван Бамбіза і Уладзімір Патупчык.

## Чвэрць пенсіянераў

Вывучэнне датаў нараджэння чыноўнікаў паказала, што сярод беларускага кіраўніцтва ажно 15 чалавек (25,9%) — людзі пенсійнага ўзросту. Маладым кадрам Лукашэнка не даверае.

На пенсіі павінны ўжо сядзець спікеры абедзвюх палатаў парламенту Барыс Батура і Уладзімір Андрэйчанка, галоўны суддзя Валянцін Сукала, старшыня Камітэту дзяржкантролю Зянон Ломаць, старшыня Нацбанку Пётр Пракаповіч, кіраўнік справаў Аляксандра Лукашэнкі Мікалай Дамашкевіч, а таксама Уладзімір Сямашка, Мікалай Зайчанка, Уладзімір Белахвостаў, — міністры інфармацыі — Уладзімір Русакевіч, лясной гаспадаркі — Пётр Сямашка, абароны — Леанід Мальцаў, па падатках і зборах — Ганна Дзейка, кіраўнік ВПК Мікалай Азаматаў, старшыня Брэсцкага аблвыканкаму Канстанцін Сумар.

## Дуаен Азаматаў

Дарэчы, самым сталым у гэтым спісе з'яўляецца старшыня Ваенна-прамысловага камітэту Мікалай Азаматаў. Яму ажно 71 год.

Яшчэ семнаццаці чыноўнікам 55 і больш гадоў. Людзі пенсійнага і перадпенсійнага ўзросту складаюць найбольшую частку ў найвышэйшых эшалонах улады. Такім чынам, далейшыя кадравыя перастаноўкі проста непазбежныя.

## Наймалодшы — Латушка

Тытулам самага маладога чыноўніка можа пахваліцца навасьпечаны міністр культуры — 36-гадовы Павел Латушка. Толькі на год за яго старэйшая Наталля Пяткевіч. Больш 30-гадовых ва ўладзе няма.

За імі ідуць Мікалай Снапкоў (40 гадоў), старшыня памежнага камітэту Ігар Рачкоўскі, міністр спорту і турызму Алег Качан (абодвум па 41 годзе), намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Валерый Міцкевіч, Энвер Барыеў, Вадзім Зайцаў (усім па 45).

Сярэдні ўзрост беларускага чыноўніка найвышэйшага рангу складае 54,2 гадоў. Цікава, што да нядаўніх кадравых зменаў у чатырох міністэрскіх фатэлях і ў адным дзяржаўным камітэце сярэдні ўзрост складаў 54,9 гадоў — роўненька столькі, колькі мае і Аляксандр Лукашэнка (нар. 30 жніўня 1954 г.). Цяпер лідэр дзяржавы стаў крышку старэйшым за людзей з свайго атачэння, ці не ўпершыню за час свайго кіравання.

**Сярэдні ўзрост беларускага чыноўніка найвышэйшага рангу складае 54,2 гадоў. Гэта крышку менш, чым Аляксандру Лукашэнку (нар. 30 жніўня 1954 г.).**

## Хочаш кіраваць — паступай у Наргас

Найбольшай папулярнасцю сярод чыноўнікаў карыстаецца Наргас. Там атрымалі хто як першую, хто як другую адукацыю Ломаць, Кабякоў, Харкавец, Анфімаў, Пётр Сямашка, міністр сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра, Чэканаў, Рачкоўскі, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэту Уладзімір Зіноўскі, Цалко, Шчэрба.

Хоць яшчэ нядаўна лідэрствам валодала політэхнічная адукацыя, яе маюць 10 чалавек. Мінскі БНТУ скончылі Батура, Уладзімір Сямашка, Бура, Патупчык, Зайчанка, Анфімаў, Азярэц, Войтаў. Дыплом Навапалацкага палітэху мае Селязнёў, а Мазырскага — міністр прыродных рэсурсаў Уладзімір Цалко.

Столькі ж скончыла і БДУ. Але перавагу гэтая ВНУ мела найперш у юрыстаў — старшыня Канстытуцыйна суду Міклашэвіч, Сукала, Камянкоў, Васілевіч, Пяткевіч, Міцкевіч, Галаванаў.

Сельскагаспадарчую адукацыю маюць Снапкоў, Дзейка, Кузняцоў, Саўчанка, Русакевіч, Сумар, Андрэйчанка, Бамбіза.

Праз Вышэйшую партыйную школу прайшлі ў свой час Андрэйчанка, Ломаць, Дамашкевіч, Бамбіза, Галаванаў, Сумар. Ужо за часамі незалежнасці Акадэмію кіравання скончылі Харкавец, Снапкоў, Барыеў, Чэканаў, Зіноўскі, Шчэрба, Войтаў і старшыня Магілёўскага аблвыканкаму Пётр Руднік.

Чатыры чалавекі маюць педагагічную адукацыю (Ломаць, Качан, Русакевіч і Радзькоў). Толькі адзін Уладзімір Макей скончыў ін'яз. Дадатковы дыплом Лінгвістычнага мае і Павел Латушка, але ў афіцыйных біяграфіях гэта не адзначана.

Варта адзначыць яшчэ тое, што Макей і Руднік — адзіныя з чыноўнікаў, хто вучыўся ў краінах так званага далёкага замежжа. У 1992—1993 гадах першы праходзіў навучанне ў Дыпламатычнай акадэміі МЗС Аўстрыі, а другі ў свой час па абмене пабываў у ГДР, у Дрэздэне.

Затое абсалютна ніякай беларускай адукацыі не мае кадэбіст Вадзім Зайцаў. За ягонымі плячыма Маскоўскае вышэйшае пагранічнае каманднае вучылішча (1986), Акадэмія федэральнай пагранічнай службы РФ (1997), Ваенная акадэмія Генеральнага штабу Узброеных сілаў РФ (2004).

Сярод экзатычнага можна звярнуць увагу на тое, што Андрэй Кабякоў скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут.

## Сідорскі ў войску не служыў

З біяграфій, што змешчаныя на сайце дзяржаўнага агенцтва БЕЛТА, вынікае, што службу ў войску праходзілі Андрэйчанка, Міклашэвіч, Макей, Уладзімір Сямашка, Бура, старшыня Мінскага аблвыканкаму Уладзімір Крупец. І, натуральна, усе сілавікі.

Але, напрыклад, біяграфія Сідорскага гаворыць пра тое, што службу ў войску прэм'ер-міністр не праходзіў. Як і Пракаповіч, Харкавец, Снапкоў.

Хто дакладна ў войску не служыў, дык гэта беларускія чыноўніцы. Аднак іх у Аляксандра Лукашэнкі толькі дзве (3,4%) — Пяткевіч і Дзейка.

## Ідэальны чыноўнік — Леанід Анфімаў

Такім чынам, сярэдні беларускі чыноўнік — мужчына, які нарадзіўся за межамі краіны ці ў Мінскай вобласці, мае 54 гады і скончыў наргас. Пад гэтае апісанне найлепш падыходзіць намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Леанід Анфімаў. Чалавек абсалютна непублічны, нават шэры, але ўплывовы.

**Зміцер Панкавец**

# АБСЕ асудзіла сталінізм. Што з Лініяй Сталіна?

Парламенцкая асамблея АБСЕ асудзіла нацызм і сталінізм за генацыд і злачынствы супраць чалавечнасці. Узнікае пытанне наконт збудаванай пры Лукашэнку «Лініі Сталіна» з помнікам Іосіфу Вісарыёнавічу.

3 ліпеня Парламенцкая асамблея Арганізацыі бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе прыняла рэзалюцыю: «Аб'яднанне падзеленай Еўропы: абарона правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у XXI стагоддзі ў рэгіёне АБСЕ». У гэтым дакуменце АБСЕ асудзіла нацызм і сталінізм за генацыд і злачынствы супраць чалавечнасці, прызнала іх вінаватымі ў развязванні Другой сусветнай вайны і абвясціла 23 жніўня — дзень падпісання пакту Рыбентропа—Молатава — Днём памяці ахвяраў нацызму і сталінізму.

З юрыдычнага пункту гледжання Беларусі зусім не абавязкова рэагаваць на рэзалюцыю АБСЕ, кажа юрыст Юрый Чавусаў. «АБСЕ шукае новую задачу для існавання, таму і прымае новыя рэзалюцыі. Не думаю, што такая малаўплывовая арганізацыя можа паўплываць на вырашэнне ідэалагічных пытанняў унутры Беларусі. АБСЕ прыняла звычайную палітычную рэзалюцыю, і не трэба чакаць ад яе большага».

Прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў кажа, што яны «не каментуюць рэзалюцыю АБСЕ ад 3 ліпеня, бо гэта гістарычнае і ідэалагічнае пытанне».

Так, ідэалагічныя і палітычныя пытанні ў нашай краіне абы-хто каментаваць не можа. На тое існуе вярхоўна-галоўна-камандуючы. Вось і ўзнікае сітуацыя: АБСЕ прыняла рэзалюцыю. А мы, хоць і сябруем ужо з Еўропай, да рэзалюцыі не маем дачынення.

**Настасся Шамрэй**

# Камунізм, сталінізм, бальшавізм — тонкая розніца

Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

З гледзішча фармальнай логікі і права ПА АБСЕ прыняла правільнае рашэнне.

Ёсць дзве крайнія палітычныя плыні: камунізм (левая) і фашызм (правая). Але камунізм як плынь у сацыялізме існаваў з першае паловы XIX ст. Меліся нават рэлігійныя формы камунізму, і ў духу Евангелля тагачасныя камуністы абвяшчалі ўсіх людзей братамі. Як самастойная левая плынь камунізм аформіўся ў 1919 годзе, калі быў заснаваны Камуністычны Інтэрнацыянал. Тады ж, у 1919-м, у Італіі ўзнікаюць і першыя фашысцкія арганізацыі.

У камунізме XX ст. шмат плыняў. Адна з іх — бальшавізм. У бальшавізме вылучаецца



сталінізм.

У фашызму таксама шмат разнавіднасцяў: уласна італьянскі фашызм, фашызм іберыйскі (партугальскі і іспанскі), нацыянал-сацыялізм (быў нават беларускі) і г.д.

ПА АБСЕ зрабіла слушна, не асуджаючы камунізм як плынь, бо ў лік асуджаных маглі б трапіць камуністы — ахвяры нацызму і сталінізму, камуністы, якія загінулі, змагаючыся супраць фашызму (Італія, Партугалія, Іспанія), нацызму і сталінізму.

Калі разважаць лагічна, то, асуджаючы нацызм як адну з разнавіднасцяў фашызму, ПА АБСЕ павінна была б асудзіць і бальшавізм як адну з разнавіднасцяў камунізму. Аднак гэтага не адбылося. ПА АБСЕ асудзіла толькі сталінізм, г. зн. бальшавізм сталінскай эпохі (1930—1953 гг.).

ПА АБСЕ не асудзіла бальшавізм. Хоць сталінізм арганічна вырас з бальшавіцкай нецярпімасці, з бальшавіцкага экстрэмізму, з ленінізму, праваая думка Еўропы, мабыць, зважаючы на ахвяры, панесеныя ў эпоху сталінізму бальшавікамі і камуністамі шмат якіх краін, устрымалася ад асуджэння бальшавізму.

Супраць рашэння ПА АБСЕ вельмі ваяўніча змагалася дэлегацыя Расіі — правапераемніцы СССР. Яно і зразумела: калі права на кампенсацыю даўно ўжо маюць ахвяры нацызму, цяпер заявіць свае прэтэнзіі могуць і ахвяры сталінізму. Нямеччына ўжо даўно плаціць за злачынствы нацызму. Ці будзе плаціць ахвярам сталінізму Расія — пытанне ўжо не тэарэтычнае, пустапарожняе, а канкрэтнае і злабадзённае.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Чаму мы вяртаемся ў Будслаў

**У Мінску па вуліцах ходзяць танкі, а па небе лётаюць самалёты. Цяжка сказаць да чаго рыхтуецца горад, — да вайны ці да рэспубліканскага свята. У невялікім мястэчку Будслаў, што на Мядзельшчыне, у гэтыя дні таксама свята. У гонар Маці Божай Будслаўскай. Расчараваацца ў Будслаўскім фэсце немагчыма. Таму і не дзіўна, што людзі, якія аднойчы там пабывалі, імкнуцца наведаць яго зноў і зноў. Менавіта так Будслаўскі фэст ператварыўся ў самую значную рэлігійную падзею ў краіне. Паводле ацэнак арганізатараў, сёлета фэст сабраў тысячы людзей з дзевяці краін, пешыя пілігрымкі адолела 2500 чалавек. На фота: удзельніцы пілігрымкі.**

**ЗП**

# Кароль памёр... Дэмакратыя

Майкла Джэксана як ідала забілі «Фабрыкі зорак». Піша **Павал Касцюкевіч**.

### Таемныя спружыны «Фоташопу»

Першым цвіком у труну караля попу было караоке. Нам, якія без сарамлівасці маглі спяваць адно ля вогнішча і ў душы, давялі, што можна і варта, — няма чаго саромецца. Новаспечаныя старлеткі і старлеты, адчуўшы смак воплескаў, запісаных тымі ж караокавымі кампаніямі, пачысцілі горла і прыпусцілі на ўсе застаўкі. Так нарадзіўся «Амерыкан айдал» (у постсавецкім перакладзе — «Фабрыка зорак»). Потым пяць сталі палітыкі і спартоўцы — талент у трэніках не схаваеш. Што ты, што ты! Будзь такім, якім ты ёсць. Будзь самім сабою — і зробішся найлепшым. Крывы, касы і спяваеш кепска? Усё правільна, мы не адмаўляем... трэба глядзець праўдзе ў вочы: крывы, касы... акрамя апошняга слова «кепска». Ты спяваеш добра. Запомні і перадай іншым спажыўцам нашага прадукту.

Ты спя-ва-еш дас-ка-на-ла.

### Бяссільная злоба эліты

Цяпер ужо дакладна ўсё. Майкл Джэксан, які ўсё жыццё намагаўся зрабіцца белым і пушыстым, і якога, з усімі яго ўзлётамі і падзеннямі, сапраўды кілбасіла не па-дзіцячаму, быў бязлітасна біты «фабрычным» тузом. Замест каралеўскага двара і прыдворных уфармаваўся гаманлівы, поўны рознастайных зорак усялякіх жанраў соймік, куды дэпутатаў дэлегуюць смс-галасаваннем. Якіх у любую хвілю могуць пераабраць іператасаваць. І высунуць у кандыдаты саміх сябе. Цяпер строга: хочаш быць каралём — удакладняй: «Я — кароль арыентальнага попу Босніі і Герцагавіны» або «Ён — кароль белага джазу ў клубных установах Жмерынкі па няцотных днях». Каб усё было ясна — свабода ж!

Старажытныя грэкі былі ліхія хлопцы. Запусціўшы свой махавік дэмакратыі, яны нават не ўяўлялі, што ўлада народа дабярэцца туды, куды Макар цялят не ганяў. Прасякнутае іх ідэямі чалавецтва, вядома, верыла ў дэмакратыю як палітычную сістэму: падзелы ўладаў і ўсё такое. Але ў глыбіні душы было выключна манархісцкім: як дакладна выказаўся адзін з герояў стужкі Snatch, уладар ювелірнай крамкі ў Нью-Ёрку: «На вуліцы, можа, і дэмакратыя, але ў маёй краме — ні чорта не дэмакратыя».

У гэтай бітве перамаглі такія, як Арнольд Шварцэнэгер, якія пераканаaныя, што кожны — вядома, калі ён будзе вельмі вышінаць жылы, — зможа дарасці да кіраўніка Юнайтэд Стэйтс оф Амерыка (ці, прынамсі, да губернатара стэйта Каліфорнія). Джэксан, месяцовы хадок і спадчынны Маленькі Прынц, які разбіраў сябе па лапіку, абы не апынуцца ў пракруставым ложку пасрэднасці, зазнаў параз. Ідалы зрабіліся працейшымі. Take it easy. Нашто мучыць сябе пластычнымі аперацыямі, калі ёсць «Фоташоп»?

# Народ, што выжыў у атамных выпрабаваннях, і яго лідэр

**Рабіі Кадыр 61 год, і некалі яна была адной з самых заможных жанчын камуністычнага Кітаю. Пра уйгураў піша ўсходазнаўца Сяргей Богдан.**



Колькасьць ахвяраў нядзельных хваляваньняў ва Урумчы дасягнула 156 чалавек. Вінаватай у крывавых сутыкненнях у сталіцы Сіньцзян-Уйгурскай аўтаноміі кітайскі ўрад абвясьціў жанчыну — Рабію Кадыр **(на фота)**.

### Уйгурская Івонка Сурвіла

Рабіі Кадыр 61 год, і некалі яна была для Пекіну ўзорнай прадстаўніцай уйгурскай меншасьці. Яна займалася тэкстыльным бізнэсам, засядала ў кітайскім парламенце ды лічылася адной з самых заможных жанчын камуністычнага Кітаю. Рэжым ахвотна выкарыстоўваў яе для рэкламаваньня посьпехаў сваёй палітыкі ў дачыненьні да меншасьцяў.

Аднак аднаго разу Рабія выкарыстала сваё становішча, каб прыцягнуць увагу да парушэньня правоў чалавека ў Кітаі. Пасьля таго, як кітайскае войска здушыла ў 1997 годзе пратэсты уйгураў, Рабія выступіла ў парламенце і запатрабавала пакласьці канец гвалтам. Так яна стала ворагам Кампартыі.

У 1999 годзе уйгурская праваабаронца была па надуманым абвінавачаньні прысуджаная да васьмі гадоў зьняволеньня. З іх адседзела амаль шэсьць, пакуль Кандаліза Райс не дамаглася яе вызваленьня, зрабіўшы тое ўмовай візіту ў Пекін. Узамен кітайскі ўрад запатрабаваў ад Рабіі маўчаць наконт умоваў зьняволеньня. Але тая пачала апавядаць пра катаваньні і страты ў кітайскіх астрогах.

Адказ быў імгненны. У лістападзе 2005 г. Рабія ледзь ацалела падчас замаху на яе жыцьцё. Пяць з адзінаццаці яе дзяцей яшчэ жывуць у Кітаі, але двое сыноў — у турме. Рабія ачольвае Сусьветны уйгурскі кангрэс, тройчы яе кандыдатуру высоўвалі на Нобелеўскую прэмію міру. Яна стала для уйгураў сімвалічным нацыянальным лідэрам.

### Унутраныя расколіны магутнага Кітаю

Адначасова яна стала для Пекіну і ўвасабленнем адной з праблемаў Кітаю — праблемы этнічных меншасьцяў.

Насельніцтва Кітаю на 91,95% складаецца з уласна кітайцаў — ханьцаў. Аднак меншасьці засяляюць значныя абшары. Сіньцзян-Уйгурскі і Тыбецкі аўтаномныя раёны займаюць 30% тэрыторыі КНР. Уйгуры зьяўляюцца пятай па колькасьці меншасьцю, яны жывуць у асноўным на паўночным захадзе Кітаю, дзе іх больш за восем мільёнаў.




Гэты рэгіён мае вялікае значэньне для ўраду, бо там — значныя радовішчы нафты, газу, золата, вугалю і ўрану. Гэты край важны сваёй блізкасьцю да Індыі, Пакістану ды Афганістану.

Тое, што цяпер завецца Сіньцзянам, раней называлася Усходнім Туркестанам, і нават сёньня, маючы патрэбу ў падтрымцы іншых меншасьцяў краю, уйгурскія нацыяналісты прызнаюць яго культурную і этнічную разнастайнасьць. Гэта — вялікі край, у восем разоў большы за Беларусь, але пакрыты гарамі і пустынямі.

Культурна, моўна і гістарычна уйгуры блізкія да ўзбекаў, якіх яны лічаць страчанай часткай уйгурскага народа. Дасьледаваньні паказалі, што генетычна уйгуры на 50% належаць да эўрапеоіднай расы і на 50% — да ўсходнеазіяцкай.

З сярэдзіны IX ст. і аж да другой паловы XIX ст. уйгуры мелі дзяржаўнасьць, а іх культура была адной з найбагацейшых у рэгіёне. На іх абапіраліся манголы, каб неяк упарадкаваць сваю велізарную імпэрыю. Кручкастым уйгурскім алфавітам пісаліся мангольскія дакументы.

Пры канцы XIX ст. краіна уйгураў была гвалтоўна далучаная да Кітаю, ад якога яны адрозьніваліся чыста ва ўсім — культуры, веры, мове, гаспадарцы. Таму калі ў 1910-я ў Кітаі ізноў запануўвае хаос, Усходні Туркестан надоўга адасабляецца.

У 1933 г. уйгурскія нацыяналісты абвяшчаюць Усходнетуркестанскую рэспубліку. Да яе стварэньня актыўна спрычыніліся і расійскія белагвардзейцы, што ўцяклі ад бальшавікоў ва Усходні Туркестан.

Як высьветліў Сяргей Шупа, сярод іх апынулася і некалькі беларусаў, якія трапілі на кіраўнічыя пасады ў той дзяржаве, прычым адзін з іх стаў нават віцэ-прэм'ерам. Аднак кітайцы з савецкай дапамогай хутка вынішчылі «гняздо белагвардзейшчыны».

Наступная спроба заваёвы незалежнасьці была звязаная з намерам СССР прыяднаць уйгурскія раёны, адасобіўшы іх ад ахопленага татальнай вайной Кітаю. У 1944 г. была абвешчаная другая Усходнетуркестанская рэспубліка і сфармаваная дзяржаўная інфраструктура. Аднак у 1949 г. Масква вырашае адмовіцца ад гэтага плану і дапамагае Кітаю стлуміць уйгурскае паўстаньне.

### Ядравыя выпрабаваньні і каланізацыя

У 1955 годзе Сіньцзяну быў нададзены статус «аўтаномнага раёну» КНР. Аднак далей фальклорна-паказальнай аўтаномнасьці справа не пайшла. Урад спрабаваў асіміляваць уйгураў ды абрынуўся на аснову іх ідэнтычнасьці, якой быў іслам. Нават сёньня ўрад, у прыватнасьці, забараняе наведваньне мячэту і малітву на вясельле асобам да 18 гадоў.

Адначасова Пекін змог паўтарыць ва Усходнім Туркестане каланізатарскі экспэрымент Масквы ў Латвіі. Калі пасьля Другой сусьветнай вайны доля ханьцаў у Сіньцзяне складала 5%, дык цяпер іх ужо 40%. Уйгураў крыху больш, і разам з 1,5 мільёнам казахаў яны пакуль пераважаюць у краі.

Пекін з 1950-х гадоў актыўна заахвочвае прыезд ханьскіх работнікаў. Напрыклад, адна з буйных дзяржаўных арганізацыяў — «Сіньцзянскі корпус вытворчасьці і будаўніцтва» — адкрыта зарэзэрвавала ў 2006 г. 800 з 840 наяўных вакансіяў для ханьцаў. Уйгуры атрымліваюць мінімальную выгаду ад эканамічнага росту Кітаю, бачаць, як іх адсоўваюць на другі план у роднай старонцы дый памятаюць пра адносна нядаўнія часы незалежнасьці.

Але самае страшнае — кітайскі ўрад правёў з 1964 да 1996 году ў Сіньцзяне 45 ядравых выпрабаваньняў (з іх 23 — наземныя). Натуральна, гэта не дадало папулярнасьці кітайскай адміністрацыі, як і больш сімвалічныя акты кітайскага панаваньня. У Кашгары — уйгурскай Вільні — унікальныя кварталы старога места руйнуюць, каб збудаваць шэрыя шматпавярхоўкі.

Адначасова перасьледуюцца уйгурскія актывісты і спыняюцца спробы адкрыта абмяркоўваць праблемы выжываньня уйгураў як народа на фоне такіх праблемаў — уявіце сабе хоць гэтыя 45 чарнобыляў! І многія людзі пачынаюць дзейнічаць згодна з інстынктам самазахаваньня, не абмежаваным культурай і адукацыяй. Супрацьстаяньне набывае амаль расісцкі характар, а замест пошуку палітычнага рашэньня адбываюцца расстрэлы дэманстрацыяў і пагромы ў адказ. Як той казаў, камень робіцца выбарчым бюлетэнем. Кітайцы здаюцца уйгурам прыбышамі, што плюндруюць іх зямлю, а ў вачах кітайцаў, з падачы дзяржпрапаганды, уйгуры сталі «тэрарыстамі».

Пасьля гадоў адноснага спакою гвалтоўнае змаганьне зноў пачалося ў краіне уйгураў у 2008 г., напярэдадні Алімпійскіх гульняў у Кітаі. У выбухах і перастрэлках загінулі дзесяткі людзей. Кітайскі ўрад, лагічна разважаючы, што паводле колькасных суадносінаў у уйгураў няма ніякіх шанцаў, не бачыць патрэбы ў палітычных дамоўленасьцях ды абмяжоўваецца паліцэйскімі і вайсковымі апэрацыямі нават тады, калі выступы не маюць дачыненьня да незалежніцкага руху, як падчас апошняй дэманстрацыі, калі студэнты-дэманстранты спачатку паводзіліся мірна і трымалі ў руках кітайскія сьцягі.

***

Уйгуры не здольныя зьмяніць кітайскі ўрад самі ці дамагчыся незалежнасьці, пакуль не адбудуцца тэктанічныя геапалітычныя зьмены. Але іх і тыбетцаў адчайны супраціў дэманструе іншым незадаволеным у Кітаі, што ёсьць варыянты дзеяньняў апроч маўклівага выкананьня загадаў. У татальна кантраляваным грамадстве застаецца лапік тэрыторыі, дзе ёсьць нязгода і прага быць сабой. Этымалагічна ж «свабода» якраз і азначае — быць сабой.

Падставы для аптымізму у нацменшасьцяў Кітаю ёсьць. Анягож, нешматлікія балтыйскія народы пасьлядоўна падтачвалі савецкі дзяржаўны апарат, пашыраючы антысавецкія ідэі ў СССР, ды мелі ў тым посьпех, разваліўшы звышдзяржаву. Шанцы уйгураў ды тыбетцаў на вызваленьне акурат у тым самым — заставацца сабой і пашыраць вірус свабоды ў Кітаі.

# Увосень беларусы могуць застацца без вопраткі?

*Легендарны маскоўскі «Чаркізон», найбуйнейшы рэчавы рынак, дзяржава ўнутры дзяржавы, закрыты. Спынілі свой рух па «Вялікім чаркізаўскім шляху» шэрагі «ікарусаў» з чаўнакамі. У тым ліку і беларускімі.*

Рынак часова закрылі 29 чэрвеня. Нібыта праз парушэнні санітарных нормаў. Разам з тым, цяпер расследуецца справа пра захоўванне на складах буйных партый кантрабанды. Кіраўнік расійскага следчага ведамства Аляксандр Бастрыкін назваў рынак «гадзючнікам» і накіраваў загад на імя мэра Масквы Міхаіла Лужкова, каб той прыняў меры па ліквідацыі «абставін, якія судзейнічаюць здзяйсненню злачынстваў, звязаных з рэалізацыяй кантрафактных тавараў» на тэрыторыі рынку.

Гэты «гадзючнік» існуе ў цэнтры Масквы з канца 90-х. І ўсе даўно змірыліся з ім як з непазбежным злом, якое неабходнае для балансу ў сусвеце: гастарбайтары збывалі, а чаўнакі набывалі тавар, звычайныя людзі танна апраналіся, а тыя, хто за гэтым рынкам стаіць (Лужкоў), атрымлівалі свае мільёны. Але «раптоўна» аказалася, што Чаркізаўскі — гэта сусветнае зло, і сумнавядомы рынак стаў шыльдай змагання, пад якой, верагодна, ажыццяўляецца змаганне зусім іншае. Змаганне за падзел сфераў уплыву ў лагеры расійскіх сілавікоў.

Разборкі разборкамі, а спажывецкі рынак Беларусі шчыльна звязаны з Чаркізонам, калі не сказаць больш: менавіта адтуль у Беларусь звозіцца найбольшая частка нехарчовага імпарту. Сярэднестатыстычны беларус апрануты па апошняй модзе Чаркізона.

Асноўная альтэрнатыва Чаркізону — украінскі рынак у Хмяльніцкім, дзе цэны прыблізна такія ж. Але перашкодай ёсць мытныя абмежаванні на беларуска-ўкраінскай мяжы. У выпадку канчатковае смерці Чаркізону прадпрымальнікі могуць запатрабаваць зменаў умоваў імпарту з Украіны.

Прадпрымальнікі цяпер сядзяць на чамаданах і чакаюць навінаў з лініі фронту. Яны не жадаюць верыць у тое, што часовы перапынак для навядзення парадку стане канцом Чаркізаўскага рынку.

**Вольга Жарнасек**

# Чалавек без якасцяў

Пра Зянона Ломаця ў цыкле «Палітбюро–2009» піша **Аляксандр Фядута**.

Ніколі Зянон Ломаць не прагнуў трапіць так высока ва ўладу. Увесь ягоны паслужны спіс даводзіць: кожнае новае ўзвышэнне Зянона Кузьміча ў лукашэнкаўскую эпоху суправаджалася яго чарговымі маральнымі ўзрушэннямі. Прычым карыстацца тымі схаванымі дабротамі, якія даваў Ломацю новы статус, ён баяўся жудасна.



**Зянон Ломаць (трэці справа).**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### З адных лаваў

Калі не лічыць Віктара Шэймана, дык сёння толькі два былыя дэпутаты Вярхоўнага Савету БССР XII склікання знаходзяцца ў тым вузкім коле, якое ў той ці іншай ступені мае ўладу. Ну, першага, дэпутата К.Вахрамеева, усе ведаюць як мітрапаліта Філарэта. Другі ж — наш сёняшні герой.

Зянон Ломаць, першы сакратар Слуцкага гаркаму партыі, здаецца, быў настолькі прыбіты наступствамі няўдалага камуністычнага путчу, што яго імя і прозвішча ведалі хіба ва ўласнай акрузе. Ён не штурхаў прамоваў з парламенцкай трыбуны, не змагаўся за асабісты рэйтынг. Такая шэрая мышка з нораў вярхоўнасавецкай большасці. Гэта зразумела. Так бяспечней.

Але тое, што посткамуністычная ўлада ў суверэннай Беларусі далёка не вечная, Ломаць ведаў добра. Ён пераконваўся ў гэтым штодня, седзячы ў сваім Слуцкім раёне і не жадаючы большага. На Случчыне ён быў гаспадаром, а Мінск... Халера яго ведае, гэты Мінск. Ды ну яго, гэты Мінск!

Менавіта добрае веданне сітуацыі ў правінцыі дазволіла Ломацю зрабіць у 1994 г. слушную стаўку. Ломаць — адзін з нямногіх дэпутатаў ВС, які падпісаўся пад заявай аб вылучэнні Аляксандра Лукашэнкі ў прэзідэнты Беларусі. Гэта запатрабавала ад заўсёды палахлівага Ломаця такой мужнасці, што, бадай, вычарпала ліміт гэтай самай мужнасці раз і назаўсёды. Але выбар ён зрабіў і пасля перамогі атрымаў у падпарадкаванне ўсё той жа Слуцкі раён. Чаго жадаеш — тое і атрымай!

Болей Зянон Кузьміч не жадаў анічога.

### Рост азімага

Так Ломаць зноўку апынуўся ў дарагім ягонаму сэрцу цені. Ну каму цікавы старшыня Слуцкага райвыканкаму? Толькі жыхарам адпаведнага раёну, ды яшчэ начальству. Праўда, сталася так, што з тагачасным начальствам — памятным Пятром Пётухам — Ломаця звязвала меней, чым з прэзідэнтам, так што губернатары – не толькі Пётух, але ж і ягоны пераемнік — на Ломаця без дай прычыны не ціснулі. Наадварот: прэзідэнт калі каго і памятаў з раённых вертыкальшчыкаў Мінскай вобласці — дык хіба Ломаця. І кожнае пытанне «А што там Зянон? Спраўляецца?» — выклікала выключна станоўчыя адказы.

А калі адказы станоўчыя, што рабіць з чыноўнікам? Прасоўваць вышэй!

І Зянон Кузьміч быў прызначаны памочнікам прэзідэнта — галоўным інспектарам па Гомельскай вобласці.

Работа інспектара, адказнага за рэгіён, спецыфічная. З гэтай пасады чыноўнікі расстаўляюць іншых чыноўнікаў, раяць то аднаго, то другога падначаленага ў прэзідэнцкія рэзервы. І да гэтага — разборкі скандальных сітуацый, ад неўраджаю і да злоўленага на гарачым хабарніка. Фактычна галоўны інспектар — галоўны кадравік вобласці. У дадзеным выпадку — Гомельскай.

Звярніце ўвагу, як хутка ў свой час прыбраў Лукашэнка з пасады гомельскага губернатара Паўла Шыпука. Шыпук быў, па чутках, абавязаны сваёй кар’ерай усё таму ж Васілю Даўгалёву. Але высветлілася, што не ўсе даўгалёўскія кадры прыдатныя. І на змену Шыпуку быў прызначаны Аляксандр Якабсон, які не проста карыстаўся (і карыстаецца) павагай на Гомельшчыне, але і добра разбіраўся ў сітуацыі. І галоўнае — уяўляў сабе, як варта працаваць.

За губернатарам якабсонаўскай кваліфікацыі проста быць рэгіянальным іспектарам. І на пытанні, як ім працуецца, абодва адказвалі ў адзін голас:

— Нармальна! Агульная мова знойдзеная!

А большага і не патрабавалася для поўнага службовага камфорту. Затое і пра губернатара, і пра інспектара кіраўнік дзяржавы чуў толькі добрае.

### Новае прызначэнне

І Ломаця было вырашана падвысіць. Прызначыць міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання. Што, у прынцыпе, і адукацыі ягонай адпавядала. Але зусім не апавядала яго ўласным жаданням і інтарэсам.

Зянон Кузьміч не хацеў быць міністрам — і ўсё тут! Ад галіны, у якой Лукашэнка разбіраўся нават лепей, чым у хакеі і міжнародным становішчы, патрабаваліся канкрэтныя вынікі. А імі Ломаць пахваліцца не мог. Галіна патрабавала рэформаў, а ў Ломаця не было ні сілы волі, ні разумення, якое, прыкладам, было ў Васіля Лявонава, альбо, ужо ў пасляломацеўскую аграрную эпоху, у Леаніда Русака.

Затое Зянон Кузьміч добра зразумеў, што калі ён не паспее пакаяцца ў сваёй бездапаможнасці да пакарання, дык пакаранне пахавае ягоную кар’еру канчаткова і незваротна. І ён паспяшаўся пакаяцца.

Так здарылася неверагоднае. У гісторыі суверэннай Беларусі Зянон Ломаць стаў першым чальцом ураду, які сумленна прызнаўся прэзідэнту, што не спраўляецца са сваімі абавязкамі. За што і заслужыў не толькі адстаўку (цалкам натуральную ў дадзеным выпадку), але і вяртанне ў ранейшы статус памочніка кіраўніка дзяржавы. А таксама нязлое ціхае слова Аляксандра Лукашэнкі, які асобна адзначыў сумленнасць і прынцыповасць вернага паплечніка. Маўляў, не спраўляўся чалавек — за што ж яго выкідаць? Такія сумленныя і прынцыповыя людзі патрэбныя. Будзе кантраляваць.

### Ломаць не тоне

Нам ужо давялося ў артыкуле пра Андрэя Кабякова казаць, чым ёсць у жыцці беларускага грамадства і дзяржавы кантралёры. Але Ломаць і тут, як і ва ўрадзе, стаў выключэннем. Яго папярэднікаў, Мікалая Дамашкевіча і Анатоля Тозіка, баяліся. Ломаць баяўся сам. Ён успрымаў усіх навакольных як патэнцыйных начальнікаў, якіх кантралюй, не кантралюй — яны самі могуць табе нарабіць непрыемнасцяў.

Але апроч страху ў Зянона Ломаця была і несумненная перавага. Найболей ён баяўся Лукашэнкі. І гэты страх рабіў яго непадкупным і непадуладным інтрыгам. Словам, Ломаць сапраўды быў гатовы працаваць і за страх, і за сумленне адначасна. А вось лабіраваць чыесьці інтарэсы ён катэгарычна не ўмеў. Што і давялі два выпадкі, інфармацыя пра якія пратачылася ў незалежныя СМІ.

Першы — гісторыя з зяцем Ломаця, сціплым працаўніком-міліцыянерам. Паводле чутак, Алег Рашчэня мірна служыў. Ну, як бывае, часам здраджваў любімай прафесіі на баку (мне казалі, што ганяў машыны з-за мяжы, як, у прынцыпе, робяць многія суайчыннікі, каб зарабіць на годнае існаванне). Мужыка арыштавалі, прышылі такое злоснае парушэнне заканадаўства, што ўплывовы цесць не наважыўся заікнуцца за сваяка. Так вось выходзіць: у Молатава і Калініна сядзелі жонкі, а галоўны кантралёр Беларусі маўкліва праглынуў сямейнае няшчасце дачкі.

Прычым адразу адзначу, што ведаю абсалютна дакладна ад людзей, што бывалі ў кватэры арыштаванага: паводле іх словаў, казнакрады і парушальнікі дзейнага заканадаўства так не жывуць. Так бедна і проста жывуць якраз тыя рабацягі, якія, у адпаведнасці з помным праклёнам савецкіх часоў, жывуць на адзін заробак. Дастаткова было б цесцю прывезці прэзідэнта ў госці да любімай дачкі, каб той усё зразумеў. Але — не прывёз. Тым самым яшчэ раз засведчыў грамадзянскай супольнасці: «У нас проста так не саджаюць!» І хаця грамадства — дакладней, тая ягоная частка, якая ведае і пра існаванне самога Ломаця, і пра ягонага зяця, — якраз перакананае ў адваротным, ніхто нікому нічога дадаткова тлумачыць не стаў. Нічога пра сапраўдныя прычыны арышту блізкага сваяка аднаго з самых высокапастаўленых чыноўнікаў краіны да гэтага часу невядома.

Падобна аднак, што зяця Ломаця пасадзілі і сапраўдны не «проста так». Цэлілі відавочна ў цесця. Але цесць ацалеў.

Не падзейнічалі на Зянона Ломаця і спробы фізічнага ўразумлення. Дакладней, падзейнічалі, але зусім не так, як разлічвалі тыя, хто іх планаваў і арганізоўваў. Памятны скандал са збіццём старшыні Дзяржкантролю ў магілёўскім гатэлі «чэкістамі», якія замаскаваліся пад міліцыю, каштаваў пасады «Сцёпу-генералу» — старшыню КДБ Сцяпану Сухарэнку. За што Ломаця білі — дагэтуль незразумела. Мо арганізатары збіцця хацелі прадэманстраваць Лукашэнку: вось такія падонкі ў пагонах, нават ягняці прэзідэнцкага не шкадуюць дзеля сваіх «мянтоўскіх» інтарэсаў! Але бяскрыўдны Ломаць, хаця і пацярпеў фізічна, умацаваўся палітычна. Давер Лукашэнкі да яго толькі ўзрос. Кіраўнік дзяржавы наагул любіць тых, хто пакутуе за яго (прыгадайце: ён нават пасля забойства магілёўскага кантралёра Мікалуцкага казаў, што на месцы дарагога нябожчыка павінен быў быць ён!) А Ломаць — адзіны, хто дзеля добрасумленнага выканання службовых абвязкаў і дэманстрацыі лаяльнасці да кіраўніка дзяржавы сцярпеў, што яму пысу набілі, і нават не стаў пярэчыць супраць адпраўкі пацукалова Сухарэнкі паслом у Арменію. Апошняе ж і наагул было ўспрынята дзяржслужбоўцамі як дадатковы да пабояў плявок. Маўляў, уцёрся кантралёр.

### Навошта патрэбны Ломаць?

На самай справе Камітэт дзяржаўнага кантролю ва ўмовах узрушэнняў эканамічных і палітычных пачаў выконваць прынцыпова новую функцыю. Да гэтага часу ён быў кшталту ці то паслабляльнага (праверкі КДК маглі скончыцца вывяржэннем дзяржслужачых самага высокага рангу з нетраў дзяржаўнага апарату), ці то скальпеля ў руках Шэйлака, які прагне атрымаць плату ў выглядзе кавалку гарачай плоці.

Цяпер, напярэдадні чарговых выбараў, падчас якіх падпарадкаваць чыноўнікаў страхам Лукашэнка больш не спадзяецца, найвышэйшая дзяржаўная ўлада перастала разыгрываць спектаклі з удзелам «кепскіх баяраў» — прынамсі, у ранейшай, абражальнай для «кепскіх баяраў» версіі. Зянон Ломаць, божы дзьмухавец, павінен стаць своеасаблівым супакаяльным сродкам, такой сабе валяр’янай. Маўляў, нічога не адбываецца, стратаў і пасадак болей не будзе, а таму гэтым разам не падвядзіце! «Прагаласуйце» як трэба.

Гэта тым больш важна, што вынікі галасавання рэальна забяспечваюць сёння ўсяго толькі... сем чалавек. Шэсць губернатараў і мінскі гараданачальнік. Агучка — так, гэта на нястомнай Лідзіі Міхайлаўне, якая мірна разгульвае па Мінску ў чорных акулярах, каб у вочы незнарок хто-небудзь лішні не зірнуў. Але рэальныя вынікі — толькі яны. А таму ні Даўгалёў-«морж», ні Дамашкевіч-«бульдог», ні Тозік-«энтузіяст» на месцы галоўнага кантралёра — таго, хто іх, губернатараў, якраз і трымаў бы у парадку, — ужо не прыдатныя. Ім патрэбныя «спакой і воля», як пісаў іншы класік, раз шчасце забяспечыць яны самі сабе не жадаюць. Так сказаць, патрэбная імітацыя шчасця — імітацыя свабоды. І Ломаць у гэты момант — якраз на сваім месцы.

### Зянон — але не ён!

Так Зянон Кузьміч стаўся адзіным і непаўторным сярод чальцоў нашага «Палітбюро», які атрымаў увесь свой уплыў зусім не таму, што ягоныя асабістыя якасці такія яскравыя. Наадварот — менавіта таму, што ён не валодае ніякімі якасцямі. Наагул. Ён нікому не пагражае, нікому не зайздросціць, не пераследуе ўласных інтарэсаў. Ён усяго толькі выконвае свае абавязкі — то бок волю асобы, якая прызначыла яго на тую ці іншую пасаду.

Гэта задавальняе ўсіх. І самога Ломаця. Не баяцца і не зайдросцяць — значыць, няма чаго баяцца і мне. Можна спакойна разгульваць у напяленай на цябе ваўчынай скуры і толькі ў прысутнасці жонкі і дачкі рабіцца тым ягнём, якім, уласна, спадар Зянон і з’яўляецца. Палохае ў дадзеным выпадку не чалавек, а пасада: бо, як правіла, на плоце можа быць напісана што заўгодна, нават «Жыве Беларусь!» — але ляжаць за ім чамусьці дровы.

Увесь ягоны ўплыў — у адсутнасці ўплыву, бачнага і нябачнага, на тое, што адбываецца. Дзякуй Богу, нарэшце знайшоўся чалавек, які не замінае нам жыць.

Крыўдна адно. Гавораць, што імя вызначае шмат у чым чалавечую сутнасць (ну, і палітычную таксама). А якое гордае імя носіць!

**Раней у цыкле:**

«Уладзімір Макей. Другі твар» № 14
«Наталля Пяткевіч. Русалка на аблоках» №16
«Юры Жадобін. Генерал мірнага часу» №17
«Сяргей Ткачоў. Чалавек–невідзімка» №18
«Пётр Пракаповіч. Будаўнік у банку» № 20
«Андрэй Кабякоў. Бацька хрышчонага сына» №24



# Парад прымалі два Лукашэнкі

**Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў на парад з нагоды Дня незалежнасці разам са сваім таямнічым малодшым сынам Міколкам. Абодва былі ў вайсковай форме.**

# Найпрыгажэйшыя грудзі краіны

мае беларуска Зульфія. Яна праклала імі сабе дарогу ў Парыж.

Дзень вызвалення Мінску ад нацыстаў кожны святкаваў пасвойму. Увечары 3 ліпеня ў сталічным клубе «Тытан» прайшоў першы беларускі конкурс «Міс грудзі-2009». Яго ўдзельніцай магла стаць любая дзяўчына з беларускім грамадзянствам ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў. Прэтэндэнтак на перамогу журы спачатку адбірала па фота.

11 дзяўчат, што трапілі ў фінал, змагаліся за галоўны прыз — паездку ў Парыж. Найбольшую падтрымку залы (а пасля і прыз глядацкіх сімпатый) атрымала Кацярына — дзяўчына з 7 памерам бюсту.

У першым этапе фіналу дзяўчаты за кароткі час мусілі паказаць усе свае вартасці ў найвыгаднейшым святле. Далей удзельніцы прадэфілявалі ў вечаровых строях і паспрабавалі адказаць на «інтэлектуальныя пытанні» («як засунуць жырафу ў лядоўню?», «колькі доўжылася Стогадовая вайна?»).

Наступная частка фіналу выклікала сярод гледачоў нашмат большую цікавасць: паненкі выходзілі на сцэну ў купальніках. Вядоўца прапанаваў самым смелым пазбыцца рэшты адзення. Пагадзіліся толькі дзве. Іншыя какетліва адказвалі, што зробяць гэта толькі для каханых мужчынаў.

А адна з удзельніц з незвычайным імем Зульфія спаслалася на тое, што бацька не дазволіў бы ёй так сябе паводзіць. Але ў суперфінале, калі ад паездкі ў Парыж аддзялялі ўсяго дзве канкурэнткі, давялося забыцца пра строгіх бацькоў. Тытул «Міс грудзі» атрымала Зульфія.

**Паводле «Салідарнасці»**




ЮЛІЯ РУЖАЧКА



INTEX-PRESS

# Прачнуліся «ў шакаладзе»

Пасля начной залевы 2 ліпеня склепы, падворкі і агароды трох двароў у вёсцы Скварчыцы Баранавіцкага раёну апынуліся пад важкім слоем гною, які мясцовая гаспадарка збірала паблізу ажно з мінулага году. Гноем заліло нават хаты.

Карэспандэнты «Intex-press» завіталі ў Скварчыцы ў той момант, калі пагрузчыкі з мясцовага калгасу «Аграшчара» здымалі верхні слой каравяка на прыватных падворках і вясковай вуліцы.

«А ў агародах жа нічога не збярэш. Усё папросту згарыць. А калі не, дык як такую бульбу будзеш есці — яна ўся ў г*не», — абураецца пацярпелы ад такой незвычайнай «паводкі» Леанід Вікенцевіч. Яго найбольшы боль — маладыя яблынькі малдаўскіх гатункаў, лёс якіх цяпер невядомы: выжывуць — не выжывуць. У яго жонкі Валянціны — іншы клопат: «Мае каны (кветкі. — Аўт.) мне спецыяльна прывозілі знаёмыя з Масквы... Ліліеі — кожная па 8—15 тысяч... Яны ўжо прападуць».

Разам з Валянцінай мы ў гумовіках мінаем граду з клубніцамі. Ягады таксама «ў шакаладзе».

«Клубніцы адзін раз паспела сабраць. Астатнія хтосьці выбраў без мяне. Цяпер ужо ніхто не палезе, нават злодзей», — са скрухаю кажа Валянціна.

У суседзяў Леаніда і Валянціны таксама затапіла і новы (на градах), і леташні (у склепах) ураджаі. Студні пацярпелых вяскоўцаў запламбавалі санслужбы, забараніўшы піць ваду. На пытанне «Як далей будзеце жыць?» у гэтых простых людзей знайшліся вельмі простыя адказы. Ваду можна браць у суседзяў праз пяць хатаў. Па прадукты — на рынак.

«Давядзецца цяпер лямку цягнуць... Чаму ж начальству было не на горцы каля самых хатаў гэтае возера жыжы рабіць? Але што каму дакажаш, хто будзе слухаць? У нас заўсёды смурод стаяў, як вецер падзьме. Нікому няма дзела. Скажуць: заткніся, бабка, што ты плявеш», — выракае пацярпелая кабета Зіна.

**Intex-press**

## СЦІСЛА

### «Белсат» скарачае вяшчанне

Тэлеканал будзе трансляваць перадачы толькі з 19 да 23 гадзінаў па мінскім часе. Звязана гэта з перыядам адпачынкаў і эканоміяй сродкаў. З 6 верасня «Белсат» гатовы вярнуцца да былога абʼёму вяшчання. Затое інфармацыйная праграма «Абʼектыў» павялічвае працягласць да 20 хвілінаў і будзе выходзіць, як і раней, у 21.00.

### Ахвяры купальскага агню

Двое мужчын на Віцебшчыне пацярпелі ад агню ў купальскую ноч. Жыхар Аршанскага раёну, пастух СВК «Купалаўскі», не здолеў пераскочыць купальскае вогнішча. З апёкамі твару, грудной клеткі і дыхальных шляхоў 24-гадовы дзяцюк трапіў у бальніцу. З апёкамі канечнасцяў забрала хуткая і 33-гадовага жыхара Паставаў.

### Студэнтам плацяць за ўдзел у афіцыйных святах

За ўдзел у святкаваннях 3 ліпеня магілёўскі БРСМ выплочвае студэнтам па 20 тыс. рублёў, паведаміла «Еўрарадыё». Паводле студэнта аднаго з магілёўскіх ВНУ, які «падзарабіў» на свяце, дастаткова было адзначыцца ў адпаведнага функцыянера БРСМ на некалькіх мерапрыемствах і чакаць да наступнай стыпендыі бонус у 20 тысяч. Тыя ж, хто згадзіўся стаяць са сцягамі і іншай атрыбутыкай, атрымаюць удвая больш — каля 40 тысяч рублёў.

**ЛК; МБ; паводле БЕЛТА, СТВ, Еўрарадыё**

# Цуды з гарышчаў

**Карэспандэнт «НН» наведаў унікальны музей кнігі і друку ў Мёрах.**

Яго стваральнік — спадар Вітаўт Ермалёнак, краязнаўца і настаўнік гісторыі мёрскай СШ№3 з 32-гадовым стажам.

Першы свой музей, Гістарычны, ён стварыў у 1986 г., а ў 1994 г. яму было нададзенае званне народнага. У Музеі кнігі і друку, адчыненым сёлета ў студзені, за месяцы яго існавання было праведзена каля 50 экскурсій.

— Мы маем каля 15 тысяч экспанатаў, каб стварыць музей археалогіі, нумізматыкі або гісторыі Мёраў, — распавядае Вітаўт Ермалёнак. — Аднак зараз інфармацыйныя тэхналогіі развіваюцца вельмі хутка, і моладзь перастае паважаць кнігі. Таму я і вырашыў стварыць музей друкаванай кнігі.



Пачынаецца экспазіцыя з раздзелу «Вытокі пісьма» .Тут узоры кітайскіх іерогліфаў на бычынай косцы, муляжы старажытнарымскіх кніг з драўлянымі старонкамі, гліняных шыльдачак з Міжрэчча. Самы каштоўны экспанат раздзелу — сапраўдная прасліца XII ст. з надрапанымі рунамі. А найстарэйшай кнігай музею з'яўляецца «Часоўнік» 1640 г. у дубовай вокладцы, абцягнутай скурай. У раздзеле « Старадрукі» змешчаны рарытэт маштабаў краіны — том Жана Жака Русо, прысвечаны музыцы, з аўтографам нямецкага кампазітара Шумана на першай старонцы. Знайшоў яго спадар Вітаўт на гарышчы будынку ў былым маёнтку князёў Мірскіх, што ў вёсцы Каменполле на Мёршчыне. Цудамі ў беларусаў гарышчы поўняцца!

— Музей я задумаў даўно, — распавядае краязнаўца. — Спачатку не было памяшкання, потым — фінансавання. Зараз у школе вызваляюцца памяшканні. Знайшліся сродкі — дапамог аддзел адукацыі. Бацькі школьнікаў уносілі ахвяраванні, такую дробязь, як цвікі, набываў за ўласныя грошы.

Праект музею распрацавалі з школьнымі настаўнікамі працы. Разам працавалі ўсё лета. Штовечар з суседняй вёскі прыязджаў слесар, дзеці дапамагалі. Музейнае шкло каштуе шмат. А тут якраз вёска Чапукі атрымала статус аграгарадку. Шкло ў школе замянілі шклопакетамі і за непатрэбнасцю аддалі нам. А яно ж старое, крохкае. Адзін рух — і ўсё адразу сыплецца. Без крыві не абышлося. Затое цяпер усё выглядае прыстойна.

Асаблівасць экспанатаў у тым, што ўсе яны знойдзеныя на тэрыторыі Мёрскага і Браслаўскага раёнаў. Вось і скажы, што народ на перыферыі быў цёмны і неадукаваны!

Многае гісторык знаходзіў сам, штосьці набываў у перакупшчыкаў або прыносілі дзеці. Некаторыя літаральна выцягнуў з агню.

— Вяртаўся неяк у Мёры з Друі, стаяў на аўтобусным прыпынку. Гляджу — мужык у адным з двароў кнігі паліць. Я кінуўся выцягваць. На руках доўга апёкі не сыходзілі. Затое ўратаваў «Новую тэорыю земляробства» Аўгуста Адлера. Быў такі вучоны-самавук у Друі, аптэкар, займаўся анатоміяй і сацыялогіяй. Выдаваў свае працы ў Мінску і Вільні. Выходзіць, новае імя адкрыў.

Вельмі дарагі сэрцу спадара Вітаўта раздзел « Старая беларуская кніга» . Экспазіцыя змяшчае творы Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна. Школьнікам можна толькі пазайздросціць — яны маюць магчымасць пабачыць «Падручны руска-крэўскі слоўнік» Вацлава Ластоўскага або« Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа не толькі на старонках падручнікаў.

Таксама ў раздзеле выстаўленыя творы выхадцаў з мёрскага краю — Пётры Беларуса з Узмёнаў, Пётры Простага з Дзедзіны. Самы «малады» рукапіс музею — паэма невядомага аўтара «Беларускі год» 1938 г. Перапісаў яе з арыгіналу трэцякласнік Янак. Навучанне ў яго школцы было на польскай мове, а хлопчык жадаў чытаць па-беларуску. Вось і перапісаў кнігу, што прывёз у вёску знаёмы дзядзька.

Ёсць раздзел «Старыя падручнікі». Дапаможнікі XIX—п.XX стст. па геаграфіі, фізіцы, мастацкія, медыцынскія, энцыклапедычныя тамы. Не абышоў сваёй увагай гісторык і «Савецкую кнігу». Дзе вы яшчэ зможаце пабачыць «Рабоча-сялянскі буквар для дарослых» 1920 г.?

Спадар Вітаўт знайшоў шмат цікавых экспанатаў для раздзелу «Публіцыстыка». Напрыклад, часопіс «Пчаліная борць», які выдавала Зоська Верас. Тут жа і нямецкая «Грушавая газета» за 1882 г., тэматыка матэрыялаў якой — толькі... грушы.

А вось дзякуючы раздзелам «Календары», «Паштоўкі», «Маркі», «Рэклама» можна зразумець: з часам мяняецца знешні выгляд такой прадукцыі, але не змяняецца яе сутнасць. Яна, як і сто гадоў таму, адлюстроўвае настрої і жаданні грамадства.

Вось такое падарожжа ў мінулае праз кніжны свет. І вельмі дарэчы тут прымаўка: лепш раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. Таму ўсе — у Мёры ў Музей кнігі і друку! Будзьце пэўныя, там вас чакаюць!

**Ганна Журавіна**

## Яшчэ адзін фестываль аўтарскай песні на беларускай зямлі

**У вёсцы Перадолы, што на Глыбоччыне, 13 — 14 чэрвеня адбыўся фестываль аўтарскай песні.** Арганізатарамі фестывалю выступілі культурна-асветніцкі цэнтр імя Драздовіча і рэсурсавы цэнтр «Барміца» ў асобах іх кіраўнікоў Ады Райчонак і Яраслава Берніковіча.

Фестываль праходзіў на сядзібе прадпрымальніка з Падсвілля Мар'яна Місевіча. Ён заўсёды рады прыняць тых, хто любіць родны край, яго гісторыю, мову. Для такіх сустрэч ён адрамантаваў і абсталяваў свой бацькоўскі дом, на якім красуецца «Пагоня» і заўсёды ўзняты бел-чырвона-белы сцяг. У доме гаспадар аформіў стэнды, дзе змясціў свой радавод, а таксама радавы герб Місевічаў.

Напачатку надвор'е не спрыяла арганізатарам і выканаўцам. Першую частку мерапрыемства давялося правесці ў доме. Адкрыла фестываль Ада Райчонак. Менавіта ёй належыць найбольшая заслуга ў тым, што гэты фестываль адбыўся. Першым выступіў мясцовы бард Антон Марговіч. Ён выканаў некалькі песень на словы паэткі з Падсвілля Марыі Баравік. Пасля былі выступленні Касі Камоцкай, Эдуарда Акуліна, Вольгі Акуліч, Андрэя Мельнікава, Леры Сом. Такіх бардаў, як Эдуард Акулін і Вольга Акуліч, шмат якія гледачы чулі ўпершыню, але па ўсім было відаць, што іх выступленні вельмі спадабаліся.

Сярод гасцей на фестывалі прысутнічала Яніна Ермалаева, браслаўчанка, якая зараз жыве ў Швецыі. Яна падзякавала выканаўцам за магчымасць пачуць беларускае слова, распавяла пра зацікаўленасць шведаў Беларуссю.

У заключным слове Ада Райчонак выказала спадзяванне, што фестываль стане традыцыйным і набудзе такую вядомасць, як «Басовішча». Яна распавяла, што тыдзень таму была на вяселлі ўнучкі і ні разу не пачула беларускай песні. Хаця амаль усе гэтыя песні ведаюць, але існуе нейкі комплекс, які не дае беларусам спяваць на роднай мове. Вось такія мерапрыемствы і павінны спрыяць таму, каб беларусы не саромеліся сваёй мовы, а з годнасцю ёй карысталіся.

Нарэшце надвор'е злітавалася над удзельнікамі, і другая частка мерапрыемства прайшла ля вогнішча. Да позняй ночы гучалі спевы Андрэя Мельнікава, Касі Камоцкай, Антона Марговіча. Гледачы мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з бардамі.

Канечне, можа, і не ўсё было арганізавана так, як хацелася. Але гэта быў першы раз, і ёсць надзея, што ў наступным годзе кола гледачоў і выканаўцаў пашырыцца.

**Зміцер Лупач, Глыбокае**

## Пра закупныя цэны на мяса

**Ніхто не ведае, колькі каштуе 1 літр бензіну ці саляркі па сабекошце, якая там рэнтабельнасць.** Не будзем браць хлеб, возьмем закупныя цэны на ялавічыну — 3000 руб. і свініну — 5000 руб. У 1980-я закупныя цэны былі 2 рублі за 1 кг жывой вагі. Вараная каўбаса тады каштавала 2 руб. за кілаграм, цяпер — 10 000 рублёў, пяльмені — 50 капеек за 0,5 кг, цяпер — 4000 руб. Нашая радасць «ліверка» (50 кап. за 1 кг) цяпер каштуе 3—5 тыс. руб. У чым жа розніца? Склад памяняўся? Не, толькі цана. Сёння сорамна, што пры ўсім дастатку мы не можам накарміць дзяцей.

**Сямён Г., Гродзенская вобласць**

## Траянская карова

**Маскоўцы хочуць прыдбаць дванаццаць беларускіх малаказаводаў.** У Міністэрстве харчу прагнуць расійскіх нафтагандляроў дзеля інвестыцый, новага абсталявання і добрай прадукцыі.

Заводы без сыравіны, то бок малака, нікому непатрэбныя. Праз небагата часу маскоўцы запатрабуюць прадаць ім калгасныя латыфундыі з каровамі, дапаможнымі бугаямі, пастухамі, даяркамі, слесарамі, ветэрынарамі і пад. Далей, адкусваючы ласыя кавалкі беларускай эканомікі, наш манапольны неакаланіяльны пакупнік анічагуткі не пакіне беларусам. Не паспелі мы ў руках патрымаць сваё, як яно зноў патрапіць у «саюзнае» падпарадкаванне. Так і застануцца нашы людзі маргіналамі, не патрапіць ім у «сярэдні клас», то бок дробную буржуазію.

Гэта вельмі небяспечная перспектыва.

А як жа з грашыма для інвестыцый?

Лукашэнка хвайна зрабіў бы, калі б запатрабаваў ад крамлёўскага дуэту кампенсацыі за войны 1812, 1914—1920 гг., 1941 году, за масавыя дэпартацыі, раскулачанні. Прэцэдэнт таму ёсць: Італія пагадзілася адплаціць Лівіі за акупацыю. Калі б такія ж патрабаванні выставіла б і Украіна ды іншыя былыя калоніі, то было б яшчэ лепей.

**Мікалай Бусел, Дубрава (Светлагоршчына)**

## Адсутнасць беларускамоўнай ВНУ — гэта законна ці не?

**Мой сын яшчэ ў пятым класе ўдзельнічаў у алімпіядзе па хіміі.** Ён мае выразную схільнасць да прыродазнаўчых навук. Неўзабаве скончыць школу. Чаму ён не мае магчымасці паступаць у беларускамоўныя ВНУ на абраную ім дысцыпліну? Бо ва ўсёй краіне няма аніводнага беларускамоўнага універсітэту. Скажыце, калі ласка, ці гэты факт сведчыць, што «Рэспубліка Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай... мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця» («Закон аб мовах», артыкул 2), ці гэта парушэнне Дзяржаўнага Закону? Я хацеў бы атрымаць ад міністра адукацыі Аляксандра Радзькова адказ гэткі ж ясны, як і пытанне: адсутнасць беларускамоўных ВНУ — гэта законна ці не?

**Генадзь Лойка, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

## ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

### Алергія

**У мяне алергія
На сшыткі ў кратку,
Падручнікі, крэйду
І слова «заняткі».**

**Псуецца настрой мой
Ад самага рання,
Мне моташна
Нават ад слова «чытанне».**

**Ад лічбаў ужо
Рабаціць уваччу.
Я больш не магу,
Я дадому хачу!**

**За партаю ў класе
Сяджу невясёлы...
Што зробіш — у мяне
Алергія на школу.**

**Роберт Потл,
пераклала Таццяна Папова**



## ЕГУ запрашае

ЄНU

Пачаўся прыём дакументаў на завочнае аддзяленне бакалаўрскіх праграм у Еўрапейскі гуманітарны універсітэт. Прыём ажыццяўляецца на наступныя бакалаўрскія праграмы:

– Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія;
– Візуальны дызайн і медыя;
– Культурная спадчына і турызм;
– Медыі і камунікацыя: Візуальная культура (кіно, тэлебачанне, інтэрнэт), Масавыя камунікацыі і журналістыка;
– Міжнароднае права;
– Паліталогія і еўрапейскія даследаванні;
– Сацыяльная і паліталагічная філасофія;
– Тэорыя і практыкі сучаснага мастацтва.

Прыём дакументаў будзе праходзіць да 24 ліпеня (1-ы паток). Прыём дакументаў у межах другога патоку будзе праводзіцца ад 27 ліпеня да 21 жніўня.

Азнаёміцца з працэдурай прыёму і разгляду дакументаў можна на сайце www.ehu.lt.

**НШ**

# Выправа на Грунвальд: як гэта было

Піша **Алег Дзярновіч**.

Здарылася! На нарадзе ў Берасці 8—10 снежня 1409 г. Ягайла і Вітаўт прынялі план летняй кампаніі наступнага году супраць Нямецкага ордэну. Лакальныя сутычкі, дыпламатычныя перапынкі застаюцца ў мінулым — хаўруснікі поўныя рашучасці на сваю карысць вырашыць даўняе супрацьстаянне. Такім чынам, былі абмеркаваныя асноўныя пытанні выправы: руху войскаў, іх злучэння, і галоўнае — вырашана было прымусіць Ордэн даць генеральную бітву ў полі, карыстаючыся значнай колькаснай перавагай польска-ліцвінскага войска.

Нямецкі вайсковец і гісторык Макс Элер у пачатку XX ст. вельмі высока ацэньваў сам стратэгічны план выправы. У юбілейны 1910 г. ён пісаў, што рух войскаў ВКЛ і Польшчы на Грунвальд «абуджае здзіўленне сваёй спланаванасцю». Сама ідэя ўдарыць у сэрца Ордэну, на Мальбарк, моцна адрозніваецца ад звычайнай для тых часоў тактыкі рабаўнічых нападаў на памежныя замкі. Ягайла і Вітаўт выправілася на вайну, маючы перад сабой сапраўды стратэгічныя задачы.

## Падрыхтоўка

Адразу пасля нарады Вітаўт загадаў, каб кожны ваяр, пешы ці конны, меў з сабой правіянт. У маі 1410 г. вялікі князь удакладніў — вайсковая экспедыцыя разлічаная на пяць тыдняў, і менавіта на гэты тэрмін вайсковец мусіў мець харчы. У Белавескай пушчы пачаліся вялікія паляванні на зуброў і дзікоў. Сведкі прыгадваюць, што кожнае паляванне давала 50 бочак салёнага і сушанага мяса. Прыпасы звозіліся і сплаўляліся па Віслe да польскага Плоцку.

Усю вясну Вітаўт правёў у раз'ездах. Пад Слонімам вялікі князь ледзьве не трапіў у рукі нямецкіх рыцараў — вялікі маршал Ордэну здзяйсняў рэйд у бок Берасця ды спаліў Ваўкавыск.

## Пераправа

З Трокаў Вітаўт рушыў са сваімі аддзеламі 3 чэрвеня. Яшчэ раней у паход выправілася артылерыя Вялікага Княства. Усё ліцвінскае войска злучылася 26 чэрвеня на Падляшшы на рацэ Нараў. З Поўначы прыйшлі харугвы Цэнтральнай Літвы і Жамойці, падышлі харугвы з русінскіх земляў ВКЛ, а таксама татары. 3 ліпеня ўжо на Віслe пад Чэрвіньскам, ніжэй Варшавы, Вітаўт злучыўся з Ягайлам. Дзеля гэтага яшчэ на Берасцейскай нарадзе 1409 г. было вырашана збудаваць грандыёзны пантонны мост. Шырыня Віслы тут даходзіла да 500 м. Часткі мосту былі сплаўленыя па рацэ і літаральна за паўдня сабраныя вышэй Чэрвіньску. Як сцвярджае храніст Ян Длугаш, падчас пераправы панаваў ідэальны парадак: пры ўваходзе на мост Ягайла паставіў адборны аддзел узброеных рыцараў, каб пазбегнуць тлуму і цісканіны. На канцах мосту былі пастаўленыя магутныя бэлькі, званыя «кабылянамі», — каб ніхто неарганізавана не змог наблізіцца да берагоў. Войска ўваходзіла на мост роўнымі шыхтамі, разам з гарматамі і амуніцыяй. Тое, што мост быў пантонны і меў шмат рухомых апораў на чаўнах, дазваляла пазбегнуць эфекту рэзанансу падчас размеранага руху войска. Пасля пераправы мост «на чаўнах» быў разабраны і зноў сплаўлены да Плоцку.

У чацвер, 3 ліпеня, войскі рушылі проста да прускай мяжы. У першы дзень удалося прайсці звыш 30 км. На наступны дзень войскі пераадолелі меншую адлегласць. 5 ліпеня ў польска-ліцвінскім абозе з'явіліся «міжнародныя назіральнікі» — паслы венгерскага караля Жыгімонта. Ягайлу ўжо не было чаго хаваць, і Вітаўт наладзіў урачысты агляд наяўных узброеных сілаў. Як пішуць храністы, «паводле старшых продкаў звычаю», падзяліў ён войска на гуфы і харугвы. Харугваў тых, не лічачы татараў, было сорак. Вялікі князь раздаў кожнай харугве свае знакі і распарадзіўся, «каб кожныя харугва і гуф пільнаваліся знаку і слухалі загадаў». 6 ліпеня, у нядзелю, пасля ўрачыстага раздавання штандараў, усё ліцвінскае войска прамаршыравала перад Ягайлам і Вітаўтам.



## Абоз

Далей войска мусіла ісці з вялікімі стаянкамі, бо іначай абозы безнадзейна адсталі б. Апроч правіянту, гармат і ядраў да іх войска везла з сабой запасы зброі і вопраткі. Заможнейшыя мелі намёты ды кухоннае начыньне. На сваіх баявых конях рыцары везлі толькі зброю.

Тагачаснай найменшай вайсковай адзінкай было кап'ё, якое складалася з трох чалавек (рыцара з дзідай і мячом, збраяносца і стральца з лукам ці арбалетам) і чатырох коней (адзін — падменны, на ім рыцар ехаў падчас пераходаў). На кожнае кап'ё прыпадаў як найменей адзін воз з запасамі. Заможныя паны мелі свой уласны абоз.

Калі прыняць пад увагу колькасць аб'яднанага войска ў 29 000 конных і 10 000 пяхоты, дык абоз мусіў складацца прынамсі з 10 000 вазоў. Трэба дадаць сюды вазы з гарматамі і ядрамі, з прыладамі да аблогі, вазы рамеснікаў, канцылярскія вазы і вазы лекараў... Гэта дае яшчэ прынамсі 500 вазоў. Такая калона мусіла б расцягнуцца на 84 км, даючы 8 м на адну запрэжку, як гэта падлічыў польскі гісторык Стэфан Кучыньскі. Каб прывесці ў рух такую аграмадзіну, патрабавалася некалькі гадзінаў, а пераправа праз раку доўжылася суткі ці двое.

## Пакаранні

Падчас руху такой колькасці войска здараліся, відома, інцыдэнты. Начамі з табару выходзілі «валанцёры» і нападалі на навакольныя паселішчы. Храніст Длугаш вінаваціць у гэтых нападах найперш татараў, а таксама ліцвінаў, якія не арыентаваліся, дзе землі польскага караля, а дзе прускіх немцаў. Хоць сучасныя гісторыкі маркуюць, што прынамсі частка нападаў рабілася з санкцыі караля.

Але ж былі і выпадкі сапраўды гвалтаў. Ужо на ордэнскай тэрыторыі, пад Лідзбаркам, калі войска стаяла табарам паміж азёрамі, жаўнеры захапілі і спустошылі мястэчка. Быў парабаваны і касцёл. Дзеялася гэта насуперак загадам. Пасля кароткага следства Вітаўт загадаў двум асуджаным ліцвінам паставіць сабе шыбеніцы і самім жа павесіцца ў прысутнасці ўсяго рыцарства. Пасля гэтага ваяры асцерагаліся рабаваць. Без каралеўскага загаду, прынамсі.

## Апошняя ноч

Так ці інакш, 13 ліпеня польска-ліцвінскае войска падышло за паўмілі да замку Дуброўна. Як звычайна, сталі табарам ля возера. Дзень быў спякотны.

Пасля штурму замка і горада ў рукі хаўруснікаў трапіла вялікая здабыча. Трэба было адпачыць пасля бітвы, а жаўнеры таксама жадалі ўпарадкаваць абоз, наладаваўшы яго трафеямі. Ноч з 13 на 14, а таксама дзень 14 ліпеня польска-ліцвінскае войска правяло пад Дуброўнай. Перад заходам сонца кароль загадаў выступаць на наступны дзень.

Войска пайшло адпачываць раней, чым звычайна. І праз некалькі гадзін, у ноч з 14 на 15 ліпеня, рушыла ў кірунку мястэчка Грунвальд, побач з якім стаяла войска Ордэну. Новы дзень стаў днём бітвы.




Мапа з выдатнага «Гістарычнага атласу Беларусі», выдадзенага ў ВаршавеУсходнееўрапейскім дэмакратычным цэнтрам і «Беларускім Гістарычным аглядам».

# Шчучын і ваколіцы

**На Шчучыншчыну варта ехаць ужо дзеля таго, каб пабачыць абарончую царкву ў Мураванцы. Піша Сяргей Харэўскі.**

Сярод найбагацейшае архітэктурнае спадчыны Беларусі царква ў Мураванцы займае пачэснае месца. Цяжка знайсці ў нас будынкі больш арыгінальныя паводле стылістыкі і самавітасці. Зрэшты, не так шмат старажытных храмаў дайшло да нас у першасным выглядзе... А змуравалі яе яшчэ ў 1524 г.

У Мураванцы даволі блытаная сістэма вуліц і пераездаў, трэба проста спытацца ў тутэйшых, дзе царква. Удакладніўшы — «старая».

Царква стаіць, адгарадзіўшыся ад нашага свету садамі ды яловымі прысадамі. Храм не раз рабіўся цвержаю падчас войнаў. Яго штурмавалі маскоўцы, крымчакі, зноў маскоўцы, шведы. Апошні раз, у 1706 г., абстралялі гарматы Карла XII...

Храм-цытадэль узняты на падмурак з валуноў. Магутны будынак фланкіраваны па кутах абарончымі вежамі, у якіх зробленыя байніцы. Каларыт архітэктуры храму надае спалучэнне чырвоных цагляных сценаў з тынкаванымі белымі нішамі. Усярэдзіне царква перакрытая складанымі зорчатымі гатычнымі скляпеннямі На паддашку праходзіць баявая галерэя. Пасярод храму, пад падлогай, — скляпеністыя сутарэнні, у якіх у старажытнасці захоўвалі зброю, рыштунак, царкоўную скарбніцу. Цяпер тут паўсюль можна пахадзіць, заплаціўшы пару тысяч рублёў за экскурсію.

## Свет пахаў і красак

Саўгас у Вялікім Мажэйкаве — адна з нешматлікіх гаспадарак, што гадуе лекавыя зёлкі. Важкі прыбытак: кілаграм гаючых пялёсткаў каштуе ў разы даражэй за кілаграм бульбы. Адсюль нашы зёлкі развозяцца па ўсім свеце. Уяўляеце, як растуць палі спецыяльных рамонкаў, сардэчніку, пустырніку, календулы ці мяты? Водар неверагодны. Асабліва з плантацыі валяр'яны. Паглядзець на гэтае хараство трэба абавязкова — падарожжа ў свет пахаў!

Тутсама, у Вялікім Мажэйкаве, захаваўся з XVIII ст. вялікі панскі двор Хадкевічаў. Памер сядзібы з броварам, стайнямі, клецямі, лямусам, брамамі ды флігелем уражвае.

## Сонечны гадзіннік

На Шчучын дарога ідзе праз Ішчалну. У сярэдзіне XVIII ст. тут быў збудаваны цагляны касцёл, што стаіць да нашых дзён. У ім ёсць барочныя скульптуры, гучыць арган, зроблены знакамітым віленскім майстрам Бярнацкім, звіняць старадаўнія званы. Але найбольшы рарытэт — унікальны сонечны гадзіннік. Яму больш за два з паловай стагоддзі. На круглым каменным слупе прымацаваная мядзяная пласціна — цыферблат з лініямі ад цэнтру, узятымі ў некалькі колаў. Калісьці гадзіннік вянчала трохкутная стрэлка, верхні кут якой паказваў на Палярную зорку, а цень — на дакладны час. Цяпер стрэлка напалову зламаная. На пласціне выгравіяванае імя майстра (J.Malecki), месца вырабу (Vilna), геаграфічная шырата в.Ішчална (54 *41”2’) . Абсалютна унікальная рэч!

## Больш чым райцэнтр

А вось і Шчучын. Багаты краявід. Збочыўшы з гродзенскай шашы, трапіце на вуліцу 17 Верасня, што праходзіць праз увесь цэнтр гораду. За гады незалежнасці ён відавочна змяніўся да лепшага. Тут пабудаваныя новыя дамы, крамы і банкі, папрыгажэлі старасвецкія будынкі. Высіцца дагледжаная Міхайлаўская царква. На плошчы Свабоды аточанай старасвецкімі камяніцамі, урадавымі будынкамі савецкіх часоў — сквер з фантанам. Некалькі гадоў таму аднавілі і званіцу з гадзіннікам, што закрыла сабою помнік Леніну.

Будынкі па перыметры плошчы адрэстаўраваныя з густам. Брыгады шчучынскіх мужыкоў зарабляюць на будоўлях у Польшчы, Літве і нават Нью-Ёрку, і іх досвед прыдаецца ў родным мястэчку. Традыцыі тут зніітаваныя з найноўшымі еўрапейскімі павевамі. Маляўніча размешчаны на гары і далёка бачны, аточаны лагчынамі і рэчкаю, гэты горад можна назваць элегантным. І нават фарсістым!

На другім беразе вадасховішча захаваўся велізарны палац Друцкіх-Любецкіх, які рэстаўруюць. Хоць і марудна, але пэўна. Дах крыты новай бляхай, вокны і дзверы забітыя. Але і звонку палац робіць моцнае ўражанне.

Цікава, што Шчучын — адзін з нямногіх райцэнтраў краіны, што можа пахваліцца навуковай установай. Тут дзейнічае Даследчы інстытут сельскай гаспадаркі, што займаецца вырошчваннем розных раслінаў.

Кранальна шчучынцы ставяцца да славутых землякоў. Тут, напрыклад, цэлы культ Цёткі. У Шчучыне вельмі прыгожы помнік ёй, надзіва ўдалы і сувымерны. У мястэчку Астрына таксама стаіць помнік Цётцы, у вёсцы Шастакоўцы — мармуровы крыж на яе магіле, бюст ля школы...

Памятаюць тут і выбітнага мастака Казіміра Альхімовіча, удзельніка паўстання 1863 г.

На Шчучыншчыне нарадзіўся і Валеры Урублеўскі, які дапамагаў Каліноўскаму выдаваць «Мужыцкую праўду», а ў 1871 стаў генералам Парыжскай камуны.

Шануюць шчучынцы і Вацлава Іваноўскага, пра якога ў выканкамаўскай брашурцы напісана, што ён «боролся за счастье и независимость белорусского народа», а пасля «погиб во время Второй мировой войны»... Недалёка ад Шчучына, як ехаць на Васілішкі, зберaглася сядзіба Іваноўскіх, Лябёдка. Тут у 1903 г. Вацлаў разам з Цёткай і братамі Луцкевічамі выдаў першы нумар нелегальнага часопіса «Свабода».

Заснавальнікам тутэйшае галіны Іваноўскіх быў Станіслаў Іваноўскі. Яго сын Леанард будаваў прамысловыя прадпрыемствы па ўсёй Расіі. Двойчы на ўсерасійскіх сельгасвыставах яго гародніна з Галавічполля была адзначаная залатымі медалямі. Яго сын Вацлаў вызначыў сябе як беларуса. Браты Тадэвуш і Юры з узростам далучыліся да іншых нацыянальных рухаў: адзін — Літвы, другі — Польшчы.

## Радзіма Немэна

Са Шчучына абавязкова варта наведацца і ў Васілішкі. Ад Васілішак, проста з касцёльнага цвінтару, відаць вежы іншага касцёлу ў Старых Васілішках. Гэты касцёл Святых Вярхоўных Апосталаў Пятра і Паўла быў пабудаваны на мяжы XIX і XX ст. У 1903 г. быў нарэшце адчынены... Як апавядаюць людзі, гарадзенскі губернатар Пётр Сталыпін загадаў зацерці прозвішчы фундатараў, цэлых сем'яў, якія рупіліся пра пабудову касцёлу. Праз тое, маўляў, што імя цара Мікалая II на фундацыйнай таблiцы было згаданае пры канцы, а не спачатку, як хацелася губернатару.

Ёсць у тым касцёле і табліца, прысвечаная яшчэ аднаму славутаму земляку. Старыя Васілішкі — радзіма кампазітара й спевака Чэслава Немэна (Выдрыцкага). Бацька Чэслава быў наладчыкам фартэпіяна, гадзіннікавым майстрам. Пасля смерці Сталіна тым, хто хацеў паехаць у Польшчу, далі такую магчымасць. Выдрыцкія з'ехалі... І там Чэсь, узяўшы сабе псеўданім Немэн, стаў адным з самых вядомых польскіх артыстаў у свеце. У сваіх творах выкарыстоўваў класічныя вершы, быў стваральнікам музыкі для спектакляў і тузіну кінафільмаў. У 1960—1970-я Немэн быў найпапулярнейшым вакалістам Польшчы.

Бальшыня люду ў Старых Васілішках уважае сябе за палякаў, кабеты імкнуцца як умеюць гаварыць па-польску. Пыталіся ў людзей, ну які быў Чэсь, які?

— Ён быў бардзо цікавы, не такі як вышсцы, праўдзівы поляк, шчэры каталік, ходзіл до хору, спевал. Спевал і в дому, і в школе.

— А што спяваў? Якія песні?

— «О-однозвучно звенит ко-ло-кольчик...».

Taka prawda życia! Родны край Немэн адведаў у 1970-я. Убачыў калгасны лад, зарослы ставок, у якім дзіцем купаўся, закінуты парк...

Ну вось, адсюль можна вярнуцца і да Малога Мажэйкава з Мураванкаю. Каб яшчэ раз пабачыць наш бясспрэчны цуд — стражытную царкву-крэпасць. Калі пашанцуе, трапіце на літургію, каб адчуць дзівосную акустыку і непаўторную атмасферу гэтага храму.



Храм у Мураванцы.




**Шчучын**

вядомы з XVI ст. У 1436 ваявода троцкі Пётар Лялюш заснаваў тут драўляны касцёл. Удалае геаграфічнае становішча (дарога Гродна—Ліда—Вільня), прыцягнулі да Шчучына ўвагу мажнаўладцаў. Належаў Радзівілам, Сцыпіёнам, Друцкім, у XVIII ст. перайшоў ва ўладанне маршала ВКЛ Сціпіё дэ Кампа. 23 траўня 1761 атрымаў Магдэбурскае права і герб «у блакітным полі срэбная манаграма I(gnatus) S(cipion) пад залатой каронай».

У Шчучыне размяшчаліся заснаваныя піярамі калегія, семінарыя і вышэйшая школа. Сярод выхаванцаў Шчучынскай школы піяраў — Ігнат Дамейка, Мацей Догель, Казімір Нарбут, паэты А.Петрашкевіч і Ю.Корсак. У 1804—06 у Шчучыне выкладаў французскую мову і фізіку слынны філосаф, логік, псіхолаг і паэт Анёл Доўгірд.

На сёння — 16 тыс. жыхароў. Ёсць гатэль.

**У цыкле «Маршруты па Беларусі» ў папярэдніх нумарах**

«Край за небакраем, або Беларуская Прусія» (Сапоцкінчына) № 12
«Мяжа Усходу і Захаду» (Жыткавіцкі і Лельчыцкі раёны) №13
«Балдук mon amour» (край Блакітных азёраў) №14
«Мазырскае барока» № 15
«Край белай птушкі» (Асвейшчына) №16
«Котра. Рака і пушча» №17
«Любань. Над ракой Арэсай» №18
«Нараўляншчына» №20
«Ваўкавыская готыка» №21
«Слонім і Жыровічы» №22
«Сінія цэрквы» №23
«Усходні фарпост» №24



Шчучын. Цэнтральная плошча.

# «Не па-расійску ж камунікаваць!»

### Антон Літвіненка: украінскі хімік, які з прынцыпу навучыўся гаварыць па–беларуску.

Антон Літвіненка — украінец, студэнт-хімік, навучаецца ў Кіеве. Ён самастойна вывучыў беларускую мову і выдатна гаворыць на ёй. У Мінск прыязджае да сяброў, а таксама дзеля таго, каб узяць удзел у Чарнобыльскім шляху. Паколькі сябры Антона — і мае сябры (а некаторыя нават і дачкі) — у мяне атрымалася пагутарыць з ім. Мне падалося, гэтая гутарка будзе цікавая і чытачам «НН».

**Наталка Бабіна: Адкуль у Вас цікавасць да беларускай мовы?**

**Антон Літвіненка:** Сваякоў у Беларусі я не маю, таму ў дзяцінстве з гэтымі пытаннямі не кантактаваў. Глядзеў некалі ў гасцях у Крыме перадачу беларускага тэлебачання на беларускай мове — нешта па гісторыі — было цікава і зразумела. Пасля ўжо ў інэце ў фрэндстужцы майго дзённіка выклалі абʼяву пра акцыю падтрымкі з прапановай паставіць свечку на падваконне. На некаторых форумах украінскіх зʼяўляліся беларусы.

Насамрэч пра Беларусь ва Украіне вядома няшмат, толькі апошнім часам пачалі рэгулярна зʼяўляцца звесткі пра вашу краіну. Мне было цікава даведацца, я пачаў пытацца па інэт-знаёмых, атрымаў спасылку на фансайт N.R.M., пасля знаёмствы, падарожжа ў Мінск у 2007 годзе... Ну, так вось яно і пайшло...

**НБ: Але навошта Вы вывучылі беларускую мову? Цікавіцца ж Беларуссю можна і па-ўкраінску?**

**АЛ:** Для мяне было істотна адказаць на пытанне «ці змагу?», бо адказ на яго мадэлюе сітуацыю з «пакрыўджанымі расійцамі», якім, як яны кажуць, вельмі цяжка і не хочацца вучыць што ўкраінскую, што беларускую. Таксама гэты адказ зʼяўляецца і адпаведным аргументам. Ну і спартовы інтарэс быў. Блізкасць моў таксама сыграла ролю — вывучыць найбліжэйшую да маёй мову было нескладана. Таксама я лічу, што непасрэдныя сувязі між нашымі народамі былі штучна разарваныя ў савецкі час, ці, прынамсі, спыненае іх прыроднае развіццё. Замкнуць на цэнтр — так прасцей. Для камунікацыі ж патрэбная мова. Не па-расійску ж камунікаваць!

**НБ: На сустрэчы з Юшчанкам Лукашэнка гаварыў пра роднаснасць беларускага і ўкраінскага народаў. Ён мае рацыю у дадзеным выпадку?**

**АЛ:** Я лічу, мае. Іншае пытанне — якія высновы мы робім з гэтай роднаснасці. Увогуле, сябраваць народамі, дзяржавамі — гэта прапагандысцкі штамп. Сувязі мусяць быць на ўзроўні людзей, а дзяржава можа гэтыя сувязі развіваць, ствараць умовы ці, наадварот, падаўляць. Нашы дзяржавы не зрабілі дастаткова для развіцця сувязей на ўзроўні, які дыктуе рэчаіснасць. Гэта тычыцца шэрагу пазіцый — і агучаныя раней узаемныя культурныя праблемы украінцаў у Беларусі і беларусаў ва Украіне, і цырк на так і не ўсталяванай мяжы з калючым дротам і пашпартамі. З улікам таго, што хавацца нам — і беларусам, і ўкраінцам — няма чаго адно ад аднаго, апошняе пытанне — гэта, увогуле, пытанне часу і палітычнае волі.

**НБ: Вы выдатна гаворыце. Як Вы гэтага дабіліся, якой была методыка вывучэння мовы?**

**АЛ:** Далёка не выдатна. Праскокваюць русізмы, украінізмы — часам незразумелыя суразмоўцам ў Беларусі. Таксама я часта блытаюся пры пабудове фразаў, часам у склонах. Методыка вывучэння... эх... Падручнік для самаадукацыі ТБМ, шмат кніг (у асноўным Караткевіч), музыка. Спачатку нармальнае разуменне — гэта адносна хутка, звыканне — а пасля трэба было некаму адказаць менавіта па-беларуску (здаецца, у дзённіку банэр вісеў накшталт «гаварыце са мной па-беларуску») — і пачаў складаць словы. Ну, а беларускамоўных кантактаў мне не бракуе — столькі людзей прагнуць камунікаваць менавіта па-беларуску! Але і зараз інэтны слоўнічак у мяне ўвесь час пад рукой. Сапраўдны, а не той, якія мы пакрысе складаем.



**НБ: Ого! Вы складаеце слоўнік?**

**АЛ:** Невялікі аматарскі праект, што мусіць змяшчаць словы беларускае мовы, незразумелыя носьбіту ўкраінскай (усходняга варыянту) і расійскай (http://revival.org.ua/slovnyk). Плануем у некалькі сотняў словаў укласціся — гэта і аргумент наконт блізкасці моў (200 слоў — і вы вольна чытаеце тэксты). Такія слоўнічкі можна ўключаць у выданні кніжак, напрыклад. Я лічу, што варта чытаць кнігі мовай арыгіналу, калі гэта магчыма.

Яшчэ адзін момант наконт «нармальных» слоўнікаў: афіцыйны «Беларуска-ўкраінскі слоўнік», які ў нас выпусцілі, не змяшчае шэрагу слоў, якія ўжываюцца вашай моладдзю (розныя кайданкі, ровары і гэтак далей), жаргонныя словы, словы замежнага паходжання і г. д.

**НБ: Вашы хімічныя зацікаўленні? Чым збіраецеся займацца ў хіміі?**

**АЛ:** Я — будучы хімік-неарганік, займаюся каардынацыйнай хіміяй, а дакладней паліядзернымі злучэннямі, магнетахіміяй.

**НБ: Ой! А што гэта значыць?**

**АЛ:** Мы займаемся звязваннем атамаў металаў складанымі арганічнымі ці неарганічнымі малекуламі з мэтай «зборкі» новых рэчываў, якія, пажадана, мелі б у будове паражніны. Такія рэчывы патэнцыйна могуць паглынаць разнастайныя простыя малекулы і захоўваць іх, а таксама здатныя мець цікавыя магнітныя ды іншыя ўласцівасці. Размова ідзе пра фундаментальную, тэарэтычную навуку на будучыню.

**НБ: Як Вы ўяўляеце сваю будучыню? Будзеце жыць ва Украіне ці плануеце зʼехаць?**

**АЛ:** Паездзіць па свеце, пастажавацца, паглядзець, як працуюць людзі — абсалютна патрэбна, і, я спадзяюся, у мяне гэта ўсё будзе. Але я хачу нармальна жыць у сябе дома.

Увогуле, уяўляю будучыню за навуковай працай. Прынамсі, калі мне будзе ставаць на нармальнае жыццё — а гэта рэальна — можна крыху пажыць у іншых гарадах Украіны ці бліжэйшых краін.

**НБ: Не шкадуеце аб часе, які патрацілі на вывучэнне беларускай?**

**АЛ.:** Праз вывучэнне беларускай мовы я пачаў лепей разумець існасць некаторых зʼяваў ва ўкраінскай мове, цікавіцца адпаведнымі асаблівасцямі ўкраінскай мовы. Вынік — у 20 гадоў даваўлося выпраўляць вымаўленне, бо ва Украіне мала хто вымаўляе без памылак. Ну і, пэўна, з беларусамі стала лягчэй знаёміцца.

Калі нават пры дзяржаўным стане мовы яна мае праблемы — то я, чалавек, які не жыве ў Беларусі, няздольны нешта зрабіць для гэтых людзей. А для мовы я магу зрабіць толькі адно — стварыць яшчэ адну адзінку, якая ёю карыстаецца. Я зрабіў.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# Прафесія? Гід у турме

У Вільні, на Лукішскай плошчы, у будынку былога КДБ знаходзіцца Музей ахвяраў генацыду. Падземныя хады былой турмы сёння адкрытыя для наведвання. Карцэр, пакой з мяккімі сценамі, «водны» пакой, чырванаватыя засценкі падвалу для расстрэлаў — трэба мець моцныя нервы, каб гэта ўсё глядзець. Асабліва калі агляд суправаджаюць тлумачэнні галоўнага гіда музея Рычардаса Падвайскаса. Некаторыя наведнікі падчас экскурсіі заціскаюць вушы, каб не чуць падрабязнасцяў: у гэтай камеры — допыты, у гэтай — адмысловыя інʼекцыі...

Спадар Рычардас працуе ў музеі ад часу яго заснавання.

**«Наша Ніва»: Спадар Рычардас, дзе Вы працавалі да адкрыцця музею ў 1992 г.?**

**Рычардас Падвайскас:** Я атрымаў дыплом настаўніка гісторыі. Пасля службы ў савецкай арміі працаваў у псіхіятрычным шпіталі, спецшколе для складаных падлеткаў, пакуль не зʼявіўся гэты музей.

**«НН»: Работа ў такіх спецыфічных установах была Вашым асабістым выбарам?**

**РП:** Часткова так, бо я цікавіўся псіхіятрыяй і спецслужбамі, наколькі можна было цікавіцца на той час.

**«НН»: Чаму?**

**РП:** Мая бабуля была сувязной у партызанаў, а дзед у 1941 г. удзельнічаў у паўстанні супраць савецкай улады. Бабуля мне распавядала пра сапраўдныя падзеі ў Літве шэптам, каб ніхто з суседзяў не пачуў...

**«НН»: У Літве, як і па ўсім Саюзе, настаўнікі мусілі распавядаць, што літоўцы з радасцю сустрэлі бальшавікоў?**

**РП:** Безумоўна. У прынцыпе, дагэтуль ёсць людзі, якія так сцвярджаюць. Але іх можна зразумець. Увявіце: саракавы год, няма чаго есці. І тут табе раптам даюць кавалак чужой зямлі, уладальнік якой — працавіты гаспадар — сасланы ў Сібір. То сапраўды было чаму радавацца.

**«НН»: Як узнікла ідэя стварэння музею ў вязніцы КДБ?**

**РП:** Такую думку падаў яшчэ ў 1970-я гады Баліс Гаяўскас, грамадскі дзеяч, які сядзеў у гэтай турме. Неяк ён сказаў сябрам: «Калі-небудзь мы будзем вадзіць па гэтых калідорах людзей, паказваць камеры, як у музеі». Тады гэта падавалася жартам.

**«НН»: Калі вы пачалі шукаць інфармацыю пра гэтую турму, вы шукалі пацярпелых ці супрацоўнікаў?**

**РП:** У першую чаргу шукалі былых вязняў. Але не толькі. Асабіста мне пашчасціла знайсці чалавека, які кіраваў будоўляй гэтай турмы.

**«НН»: Ці ёсць сляды беларусаў у віленскай турме НКВД?**

**РП:** Так, у нас ёсць дакладна выяўленыя прозвішчы беларусаў, расстраляных тут. Але па якіх прычынах — мы не можам сказаць, гэтыя пытанні трэба даследаваць у архіве. Толькі афіцыйна ў гэтай турме забілі тысячу чалавек.

...Падчас размовы ў кабінет гіда заходзіць харвацкі журналіст, дзякуе за дапамогу і абяцае даслаць гатовы матэрыял.

«Вось, прыязджаюць людзі з розных краін, у кожнага свой боль, і яны цікавяцца, які боль у нас, — каментуе спадар Рычардас. — У свеце мноства генацыдаў, але некаторыя былі адносна невялікімі ці замоўчваліся. Самы вялікі генацыд у свеце — індзейскі, іх знішчылі каля 12 мільёнаў! Але ці гэта шырока вядома? Амерыканцы не хаваюць гэтага, але стараюцца не афішаваць лішні раз».

**«НН»: А які лік ахвяраў Літвы?**

**РП:** Да мільёна чалавек так ці інакш пацярпела ад савецкай улады ў Літве. На маленькую Літву гэта многа.

**«НН»: Я ведаю, што Ваша другая праца — настаўнік у сучаснай турме. Чаму Вы абралі такое месца?**

**РП:** Бо на свой заробак тут я не магу паўнавартасна ўтрымліваць сям'ю. Музейшчыкі зараз, на жаль, — занядбаная прафесія.

**«НН»: Хіба музей не падтрымлівае дзяржава?**

**РП:** Падтрымлівае, але наш музей — дзяржаўны, і заробак у нас дзяржаўны. Аднак дырэкцыя ставіцца да нас з разуменнем, стварае магчымасць падпрацоўваць дзесьці яшчэ.

**«НН»: А настаўніцтва ў турме Вас не прыгнятае?**

**РП:** Не, я цікаўлюся псіхалогіяй вязняў, гэта раз. Там я выкладаю гісторыю, а пасля вязні здаюць іспыты. Ім жа таксама патрэбны атэстат. А, па-другое, далёка не ўсіх прымаюць на службу ў такое месца. А камусьці ж трэба працаваць...

**Гутарыла Стася Мініч, Вільня**




## Выйшаў чарговы нумар «Arche»

Выйшаў чарговы, пяты нумар часопісу «Архэ». Адкрывае чарговы яго Рашэд Чоўдхуры з артыкулам «Будзьма беларусцамі!». «Летува прапануе турыстам Замак Гедыміна, а Беларусь — Лінію Сталіна. Але чаму тут зьдзіўляцца, калі ў будынку КДБ у Вільні цяпер разьмяшчаецца Музэй ахвяраў генацыду, а ў Менску, як вядома, будынак КДБ так і застаўся будынкам КДБ», піша ён.

Таксама ў нумары — Андрэй Пачобут друкуе «Паразу Лукашэнкі» і іншыя эсэ, Зміцер Віцько выступае з «Трактатам супраць «літвінаў», Рышард Радзік публікуе артыкул «Канстанцін Каліноўскі ў святле дакументаў».

Упершыню па–беларуску публікуецца падставовы для беларускага нацыятварэння ў XIX стагоддзі тэкст — кніга палкоўніка польскай арміі Аляксандра Рыпінскага «Беларусь», што выйшла ў Парыжы ў 1840 годзе.

# Басовішча-2009



17—18 ліпеня ў Гарадку (Польшча)) — 20-ы фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча-2009». Бяруць удзел: «Мроя», ULIS, «Палац», «Бонда», N.R.M., «Крама», IQ48, «Дзецідзяцей»... Весці фэст будзе Віктар Шалкевіч.

Паводле арганізараў фестывалю музыкі маладой Беларусі «Басовішча», сёлетнія канцэрты маюць ператварыцца ў «машыну часу»: на сцэне будуць выступаць хэдлайнеры першых «басоў», а ў спецыяльных намётах пакажуць відэа ад першых фэстаў. Тым часам Вольскі, Варашкевіч і Корань рэпетуюць свае старыя праграмы.

Такім чынам, **17 ліпеня,** паводле старадаўняй — сляды якой губляюцца яшчэ ў дагістарычным 1990-м — завядзёнкі, беларусы паедуць у запаветны лес пад Гарадком (Польшча) і дваццаты раз запар адновяць дагістарычнае, з тых часоў, калі пра «Славянскі базар» нават чуваць не было, дзейства: пад электрагітары прашчураў і дзядоўскія бубны танчыцьмуць-сядзецьмуць-ляжацьмуць перад сцэнай, адпраўляючы фэст рок-ураджаю «Басовішча».

На «Басовішчы» выступяць бацькі белроку: **ULIS**, **«Палац»**, **N.R.M.**, **Neuro Dubel**. І рок-сынкі: **Lao Che** (папулярны польскі гурт), **«Дзецідзяцей»** (рыхтуе беларускамоўную праграму), гурт **«Жнюв»**, **«Босае сонца»** (дэбютны выступ на фэсце). У дадатак, некаторыя рок-бацькі ператворацца ў рок-дзядоў: выкарыстоўваючы пракаветную магію трансформераў і пластычную хірургію саўнду, N.R.M. перакінецца ў **«Мрою»**, а «Крама» — у **«Бонду»**. Ulis неўміручы, адпаведна, зробіцца самім сабою ўзору п.п.1990-х. Вядзе фэстываль дасведчаны жрэц **Віктар Шалкевіч**.

Квіткі. Зноў жа, паводле старажытнай традыцыі, бясплатны ўваход.

Як дабрацца? Едучы на аўто (што канечне прыемней), не забывайцеся, што на мяжы — колькігадзінныя чэргі. Ідучы з Беларусі пехам, ведайце, што ўсё ж далекавата — 20 км пушчай. Тут заўсёднікі лясных рок-зборышчаў раяць камбінаваны эканом-ход: да Гродна — маршруткаю, тамака — цягнік Гродна—Кузніца—Беласток, а ужо з Беластоку — рэйсавым аўтобусам Беласток—Гарадок.

**ЛК, паводле tuzin.fromby.net i generation.by**

**Дзеля атрымання візы неабходна:**

1. Даслаць на адрас zasvabodu.hrodna@gmail.com сваё імя і прозвішча, нумар пашпарту з пазнакай «РУХаем на БАСОВІШЧА!»
2. Прынесці пашпарт (тэрмін дзеяння не павінен заканчвацца раней за 19 кастрычніка 2009 г.) па адрасе: Гродна, Будзёнага, 48а-44 (памяшканне Таварыства Беларускай Школы). Пашпарты можна прыносіць **да 9 ліпеня** між **17.00 і 19.00**.
3. Копію 32 і 33 старонак пашпарту.
4. Адзін фотаздымак на польскую візу (фотамайстры ведаюць).
5. Запоўніць на месцы анкету на атрыманне візы.
6. Набыць страхоўку на час фестывалю (страхавая фірма будзе працаваць у гэтыя дні таксама ў памяшканні ТБШ, Будзёнага, 48а-44).

Дадатковая інфармацыя: zasvabodu.hrodna@gmail.com

**Расклад**

**Пятніца, 17 ліпеня**
**19.00** Жнюв
**19.30** Тарпач
**20.00** Адкрыццё фестывалю
**20.10** Sok
**20.45** «Бан-Жвірба»
**21.25** BN
**22.15** RIMA
**23.05** ZERO-85
**00.00** «Зніч»
**00.50** IQ48
**1.40** «Сцяна»

**18 ліпеня**
Праграма з нагоды юбілею (выстава, запісы мінулых гадоў)
**17.00** «Рахіс»
**17.35** «Босае сонца»
**18.15** «Дзецідзяцей»
**19.00** Osimira
**19.45** «Палац»
**20.30** «Крама» + «Бонда»
**21.30** Lao Che
**23.00** Neuro Dubel
**23.50** «Уліс»
**00.50** N.R.M. + «Мроя»

## КАНЦЭРТЫ




**«Грунвальдскі фэст» у «Рэактары»**

Штогадовы «Грунвальдскі фэст», прысвечаны бітве 1410 году пад Грунвальдам, пройдзе **15 ліпеня ў клубе «Рэактар» (В.Харужай, 29)**. У фэсце бяруць удзел гурты **Стары Ольса**, **Litvintroll**, **Рокаш**, **Testamentum Terrae**, **Яварына**, **Кейлі Кёл**, **Cornu Copia**, **Расалія** і іншыя. **Пачатак а 18-й.**

**OPEN FEAST пад Слонімам**

Фестываль электроннай музыкі «OPEN FEAST» пройдзе **10 ліпеня непадалёк ад Слоніма, у полі між вёскамі Чэмеры і Сынкавічы**. У ім маюць узяць удзел ды-джэі з Мінску, Гомеля, Масквы. Аматары змогуць пачуць электронную музыку ўсіх напрамкаў: «хаўс», «прагрэсіў», «электра», «тэхна», «дрэм-эн-бас» і «транс». Будзе арганізаваны даезд з аўтавакзалу Слоніма да фестывальнай пляцоўкі.

**Беланогая ў Маладзечне**

Канцэрт Таццяны Беланогай адбудзецца **12 ліпеня (нядзеля) у Маладзечне, у кавярні «Метро» (Скарыны, 19а)**. **Пачатак у 19.30.**

## ВЫСТАВЫ

**Традыцыйнае мастацтва Карэі**

**У мастацкім музеі да 31 ліпеня** працуе выстава «Традыцыйнае мастацтва Карэі». На выставе прадстаўлены першы ў свеце разборны металічны шрыфт і адбіткі старадаўняй карэйскай азбукі Хангыль. У экспазіцыю ўключана каля 30 твораў — копіі з класічных твораў карэйскага мастацтва і працы сучасных майстроў.

**Арт-лінія**

**У галерэях Нацыянальнай бібліятэкі (пр.Незалежнасці, 116) да 30 жніўня** працуе міжнародная выстава графікі «Арт-лінія». На выставе паказана каля 140 графічных твораў мастакоў з Італіі, Аўстрыі, Арменіі, Украіны, Расіі, Беларусі, Латвіі, Польшчы, Балгарыі і іншых краін.

## ВЫСТАВЫ

# Машынкі для людзей




**Трансформеры-2: Помста праклятых**

ЗША, 2009, каляровы, 150 хв.

Рэжысёр: **Майкл Бэй**

Ролі выконваюць: **Шая ЛаБеф, Мэган Фокс, Джош Дзюамэль, Цірэз Гібсан, Джон Туртура**

Жанр: **Фантастычны баявік**

Адзнака: **6 (з 10)**

Злыя робаты-дэсэптыконы атакуюць Зямлю і мараць патушыць сонца. Сэм разам са сваёй дзяўчынай Мікаэлай, адстаўным агентам (Джон Туртура) і добрымі робатамі-машынкамі ратуе чалавецтва.

Ад чарговага галівудскага блакбастэра на тэму хлапечых гаджэтаў не варта чакаць філасофскіх адкрыццяў. Але пасля якога-небудзь «Дняпроўскага рубяжу» гэта суцэльнае адхланне.

Маецца годны набор спецэфектаў. Робаты-сабакі, робаты-грэмліны, робаты-веліканы. Усё выбухае, страляе, лётае. Цяжкавікі робяцца пражэрлівымі пачварамі, самалёты ператвараюцца ў інсекта-механічных істотаў, а лялечныя аўтамабілі — у дробных шкоднікаў. Арміі людзей і робатаў абстрэльваюць адна адну з гармат і сыходзяцца ўрукапашную.

Але самае важнае, што ўсе гэтыя механічныя штучкі — дзеля простых і зразумелых кожнаму рэчаў.

Падступная дзяўчына трансфармуецца ў жалезна-языкастую сцерву, каб паказаць, што здраджваць нельга. Аўтабот Оптымус гіне ў змаганні, каб праявіць ахвярнасць і чалавечнасць. Гнюсна-падкалодная істота, што кіруе дэсэптыконамі, намякае на кананічных «Чужых» і ўсім сваім выглядам даводзіць, як кепска быць дыктатарам і тыранам. Звыклыя аўтамабілі дэманструюць пачуццё гумару, а амерыканскія самалёты падымаюцца ў паветра, каб выратаваць простага чалавека.

І, нарэшце, бітва за Зямлю, мегатоны металу, скавытанне і выбухі і нават знішчаная егіпецкая піраміда — дзеля таго, каб хлопец прызнаўся ў каханні дзяўчыне.

Менавіта з гэтых простых прычынаў галівудскае кіно пра жалезкі — гэта кіно пра людзей.

Проста кіно.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

### 9 ліпеня

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 10 ліпеня

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Музычны тэатр** — «Ноч у Венецыі»

### 11 ліпеня

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Музычны тэатр** — «Даратэя»

### 12 ліпеня

**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Музычны тэатр** — «Лятучая мыш»

### 13 ліпеня

**Тэатр юнага гледача** — «Палачанка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»

### 14 ліпеня

**Тэатр юнага гледача** — «Папялушка»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

### 15 ліпеня

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»

### 16 ліпеня

**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэркаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севільі»

### 17 ліпеня

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 18 ліпеня

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 19 ліпеня

**Музычны тэатр** — Гала-канцэрт, прысвечаны закрыццю тэатральнага сезону

# Белае ці чырвонае,
## або Які шашлык правільны для здароўя

**Папярэдняе марынаванне мяса рэзка змяншае колькасць канцэрагенаў у ім.**

Лета. Грэцца на сонцы непажадана, бо гэта пагражае ракам скуры.

А шашлыкі, што так апетытна шыпяць на шампурах, могуць зрабіцца прычынай раку страўніка. Але хвілінку. А што, вараная кілбаса — здаравейшая ежа? Ці тушонка?

Што да шашлыкоў, то амерыканскія навукоўцы дакладна даследавалі, як трэба смажыць шашлыкі, каб яны ўтрымлівалі мінімальную колькасць канцэрагенаў.

Пад доўгім уздзеяннем высокай тэмпературы бялок, што ўтрымліваецца ў мясе, выпрацоўвае хімічнае рэчыва пад назвай гетэрацыклічны амін. У памяшканні ён можа асесці на фарках ці ў духоўцы, а на адкрытым паветры — на грылі.

### Падступныя аміны

Гетэрацыклічны амін многія навукоўцы звязваюць з разнастайнымі відамі раку. Апошнія дадзеныя даследавання, у якім узяў удзел 62 581 чалавек, паказалі, што ў тых, хто аддае перавагу добра прапечанаму біфштэксу, на 60% большая рызыка развіцця раку падстраўнікавай залозы, чым у тых, хто любіць мяса менш прапечаным альбо не есць яго ўвогуле.



**Падчас гатавання трэба высока трымаць мяса над агнём і часта пераварочваць.**

Рызыка раку падстраўнікавай залозы даволі невялікая, і спецыялісты не звязваюць яе наўпрост з гетэрацыклічным амінам. Але гэтыя даследаванні пацвердзілі ранейшыя высновы пра сувязь добра прапечанай бараніны альбо ялавічыны з ракам падстраўнікавай залозы, кажа вядучы спецыяліст Крысцін Андэрсан — эпідэміёлаг Універсітэту Мінесоты. Яна зазначае таксама, што навукоўцы аддаюць шмат увагі вывучэнню раку падстраўнікавай залозы, бо зазвычай ён прыводзіць да хуткай смерці.

### Не ў агні

Нельга вызначыць дакладна, калі добра прапечанае мяса ўжо перапечанае і колькі яго трэба гатаваць, каб атрымалася занадта. Доктар Андэрсан кажа, што чым вышэйшая тэмпература, на якой мяса гатуецца, і чым даўжэйшы час, тым большая рызыка.

Але гэта не значыць, што варта адмаўляцца ад шашлыкоў.

«Мы з мужам стараемся гатаваць мяса не на адкрытым агні», — кажа доктар Андэрсан.

Можна мінімізаваць колькасць гетэрацыклічнага аміну, калі падчас гатавання высока трымаць мяса над агнём і часта пераварочваць. Задача ў тым, каб, выпякаючы мяса, не спаліць яго. Спаленае барбекю — кепскае барбекю.

Доўгае, павольнае выпяканне мяса дазваляе вырашыць і праблему высокай тэмпературы. Спачатку выпякайце мяса ў мікрахвалёўцы, а потым над агнём (хаця гэты спосаб уводзіць у шал некаторых шэф-кухараў). А калі мяса марынаваць, асабліва ў цытрусавым соку альбо разбаўленым воцаце, можна зменшыць колькасць гетэрацыклічнага аміну на 96%.

### Дым і полымя

Часам, калі тлушч капае ў агонь, на ежу асядаюць поліцыклічныя араматычныя вуглевадароды (ПАВ). Доўгатэрміновае ўздзеянне ПАВ можа прывесці да некаторых відаў раку, але гэта не даведзена так дакладна, як у выпадку з гетэрацыклічным амінам.

Калі гатаваць нятлустую птушку, рыбу ці мяса і прыбіраць увесь бачны тлушч, можна значна скараціць колькасць ПАВ. «Чым тлусцейшае мяса, якое вы гатуеце, тым больш выдзяляецца тлушчу і тым больш утвараецца дыму», — кажа Карэн Колінз, кансультант па харчаванні Амерыканскага інстытуту даследаванняў раку. Падчас выпякання садавіны ці гародніны ні гетэрацыклічнага аміну, ні ПАВ не выпрацоўваецца. Смак дыму не паказвае на прысутнасць ПАВ.

Сядзець ля грылю, што дыміцца, — небяспечна? На адкрытым паветры — не, кажа Дэніз Снайдэр, спецыяліст па харчаванні Універсітэту Дзюка. «Але я б не стаяла проста над грылем цягам доўгага часу», — дадае яна.

### Курыца ці ялавічына?

Тое, што чалавек есць, больш важна за тое, якім чынам ежа прыгатаваная. Росшукі Нацыянальнага інстытуту ракавых даследаванняў, у якім узялі ўдзел 500 000 чалавек, паказала, што тыя, хто спажывае чырвонае мяса штодзень, маюць на 30% большы шанец памерці цягам 10 гадоў, чым тыя, хто спажывае менш. У тых, хто пераважна харчуецца рыбай ці птушкай, узровень рызыкі ніжэйшы. Многія спецыялісты раяць абмяжоўваць спажыванне мяса і замяняць яго гароднінай.

**Паводле wsj.com**

**«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 13 ЛІПЕНЯ—19 ЛІПЕНЯ**

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 13 ліпеня, панядзелак

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 9 серыя
**19.45** Прэс–экспрэс (агляд медыяў)
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.30** Госць «Белсату»: Алег Алкаеў
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Начныя здані», маст. фільм, рэж. Андрэас Дрэзэн, 1999 г., Нямеччына.
**22.55** Аб’ектыў

### 14 ліпеня, аўторак

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 43 серыя
**20.00** Беларусы ў Польшчы
**20.15** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кірыла Тураўскі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 15 серыя
**22.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.40** Аб’ектыў

### 15 ліпеня, серада

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 44 серыя
**20.00** Хто ёсць кім: «Драма Васіля Старавойтава», ч. 1
*Васіль Старавойтаў — легендарны старшыня калгасу «Рассвет», аднаго з найлепшых у СССР. Кіраваў ім 29 гадоў, двойчы Герой сацыялістычнай працы. Яшчэ да знікнення Савецкага Саюзу пачаў пераводзіць гаспадарку на рынкавыя рэйкі. Створанае на базе калгасу акцыянернае таварыства яднала больш за 50 прадпрыемстваў, быў нават уласны банк. Поспехі «Рассвету» і яго кіраўніка, які заўсёды вызначаўся незалежнасцю поглядаў і самастойнасцю, не задавальнялі Аляксандра Лукашэнку. Ён не забыўся пра тое, што падчас прэзідэнцкіх выбараў 1996 г. Васіль Старавойтаў як даверная асоба прэм’ер-міністра Вячаслава Кебіча аднойчы адкрыта выказаўся: «Лукашэнка не дарос да ўзроўню кіраўніка краіны». У 1997 г. Старавойтава арыштавалі і асудзілі. Ён правёў у вязніцы два гады...*
**20.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «Жыве Куба!», маст. фільм, рэж. Хуан Карлас Крэмата Мальбэрці, 2005 г., Францыя—Куба.
**22.40** Аб’ектыў

### 16 ліпеня, чацвер

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 45 серыя
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кірыла Тураўскі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Як пушчу стралу», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2009 г., Беларусь
**21.50** Форум (ток–шоў): «Краіна ў запоі»
**22.40** Аб’ектыў

### 17 ліпеня, пятніца

**19.00** Аб’ектыў
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Галерэя Ады», дак. фільм, рэж. Уладзімер Колас, 2007 г., Беларусь
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў, 4 серыя: «Гуманітарная палітыка»
**20.20** Беларусы ў Польшчы
**20.35** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Костка», маст. фільм, рэж. Крысціна Янда, 1995 г., Польшча. У ролях: Крысціна Янда, Даніэль Альбрыхскі.
**22.45** Аб’ектыў

### 18 ліпеня, субота

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** Чалавек–эпоха: «Ганна, сем гадоў на лініі фронту», дак. фільм, рэж. Маша Новікава, 2008 г., Расія
**20.30** МакраФон: «Minsk–Mixt—2008», ч. 4: канцэрт гурта «Svet Boogie Band»
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)




**21.35** «Дэтэрмінатар», серыял: 2 серыя
**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22.50** Аб’ектыў

### 19 ліпеня, нядзеля

**19.00** Прэс–экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 10 серыя
**20.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзень Перамогі», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, 1997 г., Польшча
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: «Дзікія пчолы», маст. фільм, рэж. Богдан Слама, 2001 г., Чэхія

# Самы вялікі дранік у Беларусі

**Гіганцкі дранік ад «Ракаўскага Бровару» можа трапіць у «Кнігу рэкордаў Гінэса».**



У гонар Купалля ў рэстаране «Ракаўскі Бровар» 6 ліпеня быў прыгатаваны самы вялікі дранік у Беларусі. Ёсць ідэя падаць заяўку на занясенне гэтага рэкорду, пастаўленага ў межах праекту «Рэкорды relax», у «Кнігу рэкордаў Гінэса».

Больш за дваццаць рэстаранаў узялі ўдзел у змаганні за рэалізацыю рэкорду. У заяўках яны ўказвалі максімальны памер таго драніка, які змогуць прыгатаваць. «Ракаўскі Бровар» назваў самы вялікі магчымы дыяметр — 1,7 м.

Агулам спатрэбілася каля трыццаці кілаграмаў бульбы і шэсцьдзесят яек. На прыгатаванне пайшло дванаццаць гадзін: каб пачаставаць гасцей у абед, шэф-кухар разам з камандай пачаў гатаваць яшчэ ўначы.

Паводле прызнання шэф-кухара Аляксея, самым складаным было перавярнуць страву. А вось таямніцы гіганцкай патэльні, на якой гатаваўся «броварскі» дранік, арганізатары так і не выдалі. Толькі адзначылі, што ў рэалізацыі задумы ім дапамагаў Мінскі хлебакамбінат. Дыяметр драніка склаў 1,62 м, трохі не дацягнуўшы да заяўленай даўжыні. Хоць яго «павялічвалі», абкладаючы па коле рэзанымі агуркамі.

У межах праекту зарэгістравана ўжо 35 рэкордаў, сярод якіх самы вялікі антыкрызісны торт, самы вялікі кактэйль махіта ды іншыя. У найбліжэйшых планах арганізатараў — знайсці ў мінскіх рэстаранах самую дарагую страву.

**ВЖ**

## КАЛЯНДАР
# Ліпень

**2** — Дзень Маці Божай Будслаўскай, апякункі Беларусі.

**3** — Дзень вызвалення Мінску ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**7** – Святы Іван у праваслаўных.

**10** — 500 гадоў таму (1509) нарадзіўся Жан Кальвін, французскі рэлігійны рэфарматар. У часы Рэфармацыі кальвінізм моцна пашырыўся на беларускіх землях.

**11** — 75 гадоў з дня нараджэння Віктара Вуячыча (1934—1999), эстраднага спевака, народнага артыста Беларусі, выканаўцы папулярных у свой час песняў «Полымя ружовых верасоў» і «Памяць сэрца».

**12** – Дзень Св. ап. Пятра і Паўла ў праваслаўных.

**18** — 100 гадоў таму ў вёсцы Вялікія Грамыкі (цяпер Гомельская вобл.) нарадзіўся Андрэй Грамыка, шматгадовы (1957—1985) міністр замежных справаў СССР, які на Захадзе праз сваю несаступлівасць атрымаў мянушку «Містэр Не».

**25** — 25 гадоў таму (1984) памёр Уладзімір Караткевіч.

**27** — Дзень абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. 27 ліпеня 1990 Вярхоўны Савет БССР урачыста абвясціў «поўны дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі». У 1991—1996 г. 27 ліпеня адзначалася галоўнае дзяржаўнае свята краіны — Дзень незалежнасці.

**Склаў ЛК**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Себежы Віцебскай губ.** Вучань гарадскога вучылішча абліў серным квасам (каторы паліць, як агонь) свайго настаўніка. Абодва паабпальваліся.

**«Наша Ніва». №25. 1909**

## АНЕКДОТЫ

* * *

Сапраўднае дно крызісу — гэта калі трохслойная японская папера яшчэ ёсць, а выціраць ужо няма чаго...

* * *

Абама пераконвае Мядзведзева:

— Калі Расія скароціць ракеты, іх можна будзе выкарыстаць на што-небудзь карыснае!

— Ага, мы з іх зробім памежныя слупы на мяжы з Кітаем! І паставім недзе адразу за Уралам...

* * *

Адкрытая вакансія для элітнага прыбіральшчыка. Праца з грашыма. Нацыянальны банк.

* * *

Турыст — парцье:

— Дзядуля, я летась праз ваш райцэнтр ехаў, дык на гатэлі тры зоркі былі, а цяпер дзве. Чаму?

— Дык прусакі ад'елі, каб іх!

* * *

Калі верыць спідометру, аўтамабіль ВАЗ 2106 стаіць на месцы з хуткасцю 20 км/г.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


**ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ**

**27 чэрвеня 2009 г.** пасля хваробы, на 76-м годзе жыцця, памёр Леанід Няхайчык. Для ўсіх, хто ведаў Леаніда Васілевіча, ён быў наймацнейшы, найдужэйшы, найдабрэйшы і наймудрэйшы чалавек гонару і чыну. Ён быў сапраўдным патрыётам Бацькаўшчыны. Дужы, моцны чалавек. Залатыя рукі. Залатое сэрца... Вечная Памяць. Самыя шчырыя і глыбокія спачуванні родным і блізкім.

**КНІГІ**

**Набуду** кнігі 1930-1960 г., перакладзеныя з расійскай мовы. Т.: (029) 705-18-44, Мікола

**ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ТРУСЯНЯТЫ**

**Прадаем** маленькіх дэкаратыўных трусянят. Т.: (029) 577-78-07, (029) 677-29-34.

**ПІЛІГРЫМКА**

**XV-я пілігрымка ўніятаў Віцебск—Полацк** распачалася 7 ліпеня і доўжыцца да 12-га. Можна ісці ўвесь шлях, а можна далучыцца на апошнія суботу-нядзелю. Як далучыцца? Для тых, хто хоча даехаць з Мінску аўтобусам 11.07 і прайсці шлях са Струння да Полацка: аўтобус ад'язджае а 8.00 раніцы з паркінгу пры ст. метро «Барысаўскі тракт». Кантакт: Юры Мазуркевіч (029) 635-83-39.

**ПРАЦА**

**Рэдакцыя інфармацыйных праграм тэлеканалу «Белсат»** шукае ініцыятыўных журналістаў у Віцебску, Брэсце і Маскве. Вымагаецца добрае веданне сітуацыі ў дадзеным горадзе і вобласці, а таксама прынамсі дзве рэкамендацыі — вітаюцца рэкамендацыі сяброў БАЖ. CV, рэкамендацыі і запыты дасылайце, калі ласка, на адрас: abjektyu@belsat.eu.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



Віншуем **Ганну** і **Алеся Юркойцяў** з нараджэннем другой дачкі.

**Сябры**



**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднооўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Генадзевіч Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6025. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 07.07.2009.
Замова № 3643.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.

ISBN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9771819161008 09025